Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 8 (5382)
ПЯТНІЦА
10 СТУДЗЕНЯ
1936 г.
Год выдання XIX

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Усебеларуская нарада па ўздыму сельскай гаспадаркі

Учора пры ЦК КП(б)Б адкрылася нарада сакратароў райкомаў партыі, старшынь райвыканкомаў, загадчыкаў райза, дырэктароў МТС па пытанню ўздыму сельскай гаспадаркі. У рабоце нарады прымаюць удзел лепшыя людзі сельскай гаспадаркі БССР, узнагароджаныя саюзным урадам, і работнікі сельскагаспадарчых навуковых устаноў.

З'яўленне ў прэзідыуме членаў бюро ЦК КП(б)Б на чале з тав. ГІКАЛО ўдзельнікі нарады сустрэлі гучнымі, доўганезмаўкаючымі апладысментамі.

Нараду адкрыў народны камісар земляробства БССР тав. БЕНЕК.

З дакладам аб практычных мерапрыемствах па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў і ўздыме сельскай гаспадаркі ў сувязі з рашэннем ЦК ВКП(б) і СНК СССР выступіў загадчык сельскагаспадарчага аддзела ЦК КП(б)Б тав. КАРТУКОЎ.

У сваім дакладзе тав. КАРТУКОЎ падкрэсліў тыя велізарныя задачы, якія стаяць у галіне перабудовы ўсёй сістэмы кіраўніцтва сельскай гаспадаркай у сувязі з выдатнейшымі падзеямі, якімі багата зараз наша краіна.

Працяг нарады — сёння ў 11 гадзін раніцы.

За 7—8 мільярдаў пудоў хлеба

У ПАХОД ЗА СТАЛІНСКІ УРАДЖАЙ!

Зварот да ўсіх калгаснікаў і калгасніц Полацкай акругі, да ўсіх калгаснікаў і калгасніц БССР

Мы, калгаснікі і калгасніцы Полацкай акругі, сабраўшыся на першую акруговую нараду калгаснікаў-стаханаўцаў для абгаворвання задач узняцця ўраджайнасці, у сувязі з гістарычнымі ўказаннямі вялікага правадыра народаў СССР таварыша Сталіна, рашылі звярнуцца да вас, калгаснікаў і калгасніц Полацкай акругі, да вас, калгаснікаў і калгасніц БССР, каб падзяліцца з вамі тымі дасягненнямі, якія мы атрымалі ў сваёй акрузе ў 1935 годзе.

Вось нашы дасягненні: у калгасы акругі ўступіла 92 проц. усіх аднаасобных гаспадарак, а зямельная плошча ў калгасах складае 94 проц. усёй зямлі акругі. Калгасы поўнасцю разлічыліся з дзяржавай па ўсіх відах загатовак, хлеба, бульбы і ільну здалі (прадалі) дзяржаве больш, чым у мінулым годзе.

На працадзень нашы калгаснікі акругі атрымліваюць у сярэднім больш 2 кілограмаў вернавых, 5 кгр. бульбы і 50 кап. грашыма, апрача гародніны і фуражных. Многія калгаснікі атрымліваюць па 4—5 кгр. збожжа, па 8—10 кгр. бульбы на працадзень. Калгаснік Воўк Уладзімір Арцем'евіч з калгаса «Чырвоны араты», Ветрынскага раёна, атрымлівае 258 пуд. хлеба, 262 пуды бульбы і 600 руб. грашыма; Гарбаценка Аляксей Ільіч з калгаса «Чырвоная сосніца», Полацкага раёна, атрымлівае збожжа 236 пудоў, бульбы 637 пудоў і грашыма 578 руб.; Пратас Канстанцін з калгаса «Серп і молат», Дрысенскага раёна, атрымлівае збожжа 304 пуды, бульбы 250 пудоў і грашыма 1.752 рублі. Такіх прыкладаў можна прывесці больш тысячы. Апрача гэтага, кожны калгасны двор мае ў асабістым карыстанні карову, авечак, свіней і птушку.

Многія калгасы ўжо зараз маюць высокія ўраджаі. Калгас «Чырвоная горка», Полацкага раёна, атрымаў ураджай аўса 100 пудоў з гектара, ячменю 113 пуд. з гектара; калгас імя Варашылава, Дрысенскага раёна, атрымаў ураджай азімай пшаніцы 119 пудоў з гектара. Калгас «Перамога», Дрысенскага раёна, атрымаў ураджай ільну 4,5 цэнтнера з гектара. Такіх калгасаў па акрузе больш сотні. Палепшылася становішча і жывёлагадоўлі. Пагалоўе рагатай жывёлы вырасла ў параўнанні з 1934 годам на 145,4 проц. (у 1934 годзе — 64.564 галавы, у 1935 годзе — 93.937 галоў). Пагалоўе свіней у 1935 годзе ў параўнанні з 1934 годам складае 155 проц., авечак—154,2 проц.

Як і ва ўсім Совецкім Саюзе, у калгасах нашай акругі з'явіліся новыя людзі—стаханаўцы. Мы ганарымся нашымі калгаснікамі-стаханаўцамі, трактарыстамі з Дрысенскай МТС—Цяста Сяргеем, апрацаваўшым 544 гектары, Кухарэнка Фёдарам з Ветрынскай МТС, апрацаваўшым 530 гектараў, Кляшчонкам Трафімам з Асвейскай МТС, апрацаваўшым 506 гектараў на трактар.

Мы разам з усімі працоўнымі БССР падзяляем вялікую радасць у сувязі з узнагародай саюзным урадам ордэнамі калгаснікаў-стаханаўцаў БССР — Бейне, Бляхеравай, Блоцкага, Клішэвіча, Юхневіча, Гарбуза, Свірыд, Драгуна, Знакава, Юрасёва, Кулай. Мы шлем ім сваё калгаснае прывітанне.

Але было-б шкодным супакойвацца на дасягнутых поспехах і не сказаць аб нашых недахопах. Мы можам і павінны даць у дваты разы больш прадуктаў сваёй працы. У гэтым нас пераконвае вопыт перадавых калгасаў і лепшыя прыклады работы калгаснікаў-стаханаўцаў. Мы не можам заставацца на ўзроўні прадукцыйнасці працы і ўраджаю 1935 года.

Нарада стаханаўцаў вітае рашэнні СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў і ўздыме сельскай гаспадаркі нячорназёмнай паласы.

Вызначаныя саюзным урадам для БССР новыя 23 МТС, 2.000 трактараў, 200 камбайнаў, 500 ільноперабілак і шмат іншых машын яшчэ больш узброяваюць і натхняюць нас на барацьбу за большэвіцкі ўраджай, каб на працягу бліжэйшых гадоў выканаць указанні любімага правадыра і настаўніка таварыша Сталіна аб штогодняй вытворчасці 7—8 мільярдаў пудоў хлеба. Мы ведаем і ўпэўнены ў тым, што ўрад БССР адпусціць калгасам нашай акругі дзесяткі навейшых складаных машын і ў наступную ўборачную кампанію праца калгаснікаў Полацкай акругі будзе аблегчана навейшай уборачнай малатнай—камбайнам.

Нарада калгаснікаў-стаханаўцаў Полацкай акругі бярэ на сябе ў 1936 годзе наступныя задачы: дабіцца ўраджаю ў сярэднім па акрузе зернавых не менш 80 пудоў з гектара, ільновалакна — не менш 4 цэнтнераў з гектара і бульбы не менш 900 пудоў з гектара; давесці гадавы ўдой малака ад адной каровы да 1.500 літраў, выхаду «дзелавых» парасят да 10 штук ад кожнай свінаматкі, на 100 проц. захаваць маладняк. На адзін трактар выпрацаваць 1.000 гектараў; на малатарні «МК-1.100» абмалаціць 1.000 тон; на малатарні «БДО-34» — 700 тон.

Для ажыццяўлення гэтых задач правесці наступныя мерапрыемствы:

Па ільну:

1. Пасеяць гатунковым насеннем 7.320 гектараў.

2. Давесці насенне ільну да 99 проц. чыстаты і 95 проц. ўсхожасці, для чаго пабудаваць у кожным калгасе, маючым пасеў ільну, звыш 20 гектараў, «ільняную горку» сістэмы «ВНІІЛ» і да 15 студзеня 1936 года закончыць ачыстку і другую праверку на ўсхожасць.

3. Да 1 лютага 1936 года падабраць лепшыя палярэднікі пад лён, у першую чаргу канюшынішча, паліну, узараную ўвосень, бабовыя, угноеныя жытнішчы і ўгноеныя прапашныя.

4. Увесь попел і завазімае ўгнаенне — калійнае, азоцістае і суперфасфат — унесці выключна пад лён.

5. У мэтах барацьбы з пустазеллем і коркай на ільне практыкаваць падсеў тарфянага парашку на глебе ад 0,5 да 1 сант.

6. Праполку ільну пачынаць як толькі з'явіцца пустазелле, але рабіць яе не менш 2—3 разоў.

7. На ўвесь час работы па ільну разбіць плошчу пасеву ільну на ўчасткі і замацаваць іх за звенямі і калгаснікамі звяна ў пасобку (сяўба, праполка, перабіранне, рассціл, падняцце са сцелішчаў і апрацоўка). Працу праводзіць індывідуальнай здзельшчынай.

8. Да 1 чэрвеня 1936 года пабудаваць у кожным калгасе бяздымную сушылку і машыну па трапанню ільну «Санталава» і на кожныя 10 гектараў пасеву—ільномалатарню «Эдцзі».

9. Пасеў ільну правесці ў ранні перыяд на працягу 4—5 дзён.

10. Цераблене ільну правесці ў ранняй жоўтай спеласці, а селекцыйныя пасевы ў жоўтай спеласці на працягу 5—6 дзён, поўнасцю выкарыстаць ільноўборачныя машыны.

11. Для аўладання складанымі ільноўборачнымі, ільноапрацоўчымі машынамі падрыхтаваць да 1 чэрвеня 1936 года 500 чал. кваліфікаваных кадраў з калгаснага актыва.

12. Для стварэння лепшых палярэднікаў для ільну будучых гадоў і высокаякаснай кармовай базы падрыхтаваць насенне канюшыны для пасеву вызначанай планам плошчы ў 1936 годзе. У кожным калгасе, маючым канюшыну, у 1936 г. забраніраваць насеннікі канюшыны — не менш 150 проц., каб забяспечыць пасеў канюшыны ў калгасах па севазвароту, а ўсяго па акрузе забраніраваць не менш 2.000 гектараў. Давесці ўраджай насеннай канюшыны да 2 цэнтнераў з гектара, для чаго забраніраваную плошчу пад насеннікі ачысціць ад пустазелля.

Па зернавых:

1. Падрыхтаваць высокаякаснае насенне для пасеву не ніжэй 98 проц. чыстаты і 95 проц. ўсхожасці.

2. Неадкладна распачаць загатоўку торфу, ілу і ўсіх іншых відаў мясповага ўгнаення ў колькасці: торфу 600 тыс. тон — у дзесяць раз больш супроць 1935 года, гною — 540 тыс. тон — 160 проц. к 1935 г. Апрача гэтага сабраць з кожнага калгаснага двара не менш 2-х тон гною. Торф з нізінных балот, кампаставаны і праветраны, праляжаўшы на паветры не менш 1—2 мес., выкарыстаць пад яравыя зернавыя і прапашныя культуры. Гной—пад яравую пшаніцу, каноплі, прапашныя і гародныя культуры. Сабраць з кожнага калгаснага двара не менш 7 пудоў попелу.

3. Пасеяць яравізаваным насеннем 3.000 гектараў — у 20 раз больш, чым у 1935 годзе, для чаго падрыхтаваць 700 спецыялістаў-яравізатараў з калгаснага актыва.

4. Пасеяць гатунковым насеннем: яравой пшаніцы «Цезіум»—2.000 гектараў супроць 690 у 1935 годзе, ячменю «Залаты»—3.785 гектараў супроць 983 гектары ў 1935 годзе, аўса «Маскоўскі» — «А-315» — 1.939 гектараў.

5. Арганізаваць кантроль і догляд у кожным калгасе азімых пасеваў, праводзячы снегазатрыманне на ўзвышаных мясцах і ломку ледзяной коркі. Увесну 1936 года правесці баранаванне азімых на плошчы 20.000 гектараў, што дасць дадаткова 30—40 тыс. цэнтнераў зярна.

6. Правесці праполку вернавых 1—2 разы.

7. Пасеяць радковай сяўбой 30 тыс. гектараў. Пасеў вернавых правесці на працягу 8—10 дзён.

8. Да 1 ліпеня 1936 г. пабудаваць ва ўсіх калгасах, брыгадах крытыя токі для захавання абмалоту збожжа з такім разлікам, каб у іх змясціць складаныя машыны, трактар або рухавік і абслугоўваючых малатарню калгаснікаў у часе работы. Пабудаваць ва ўсіх калгасах гумны, сушні, прыстасоўваючы іх па размерах да патрэбнасцей кожнага калгаса, і праспейшую сушылку для сушкі зярна.

9. У кожным калгасе выдзеліць адпаведныя плошчы ўсіх вернавых, прапашных і ільну пад насеннікі, каб забяспечыць сябе высокагатунковым насеннем.

Па бульбе:

1. Перад пасадкай бульбы адабраць лепшыя клубні на насенне, якімі толькі і рабіць пасадку.

2. Пасеяць гатунковай бульбай 1.310 гектараў супроць 178 гектараў у 1935 г. У мэтах барацьбы з пустазеллем, — 2—3-разовую акучку і праполку.

3. Арганізаваць усю работу па бульбе так, каб за кожным звяном была замацавана адпаведная плошча бульбы за ўвесь год, прымяняючы індывідуальную здзельшчыну ў звяне.

К канцу 1936 года ва ўсіх калгасах акругі ўвесці правільны севазваротаг. Арганізаваць не менш 100 хат-лабараторый і прапусціць праз курсы райза і МТС калгаснага актыва 6.000 чалавек. Арганізаваць у 350 калгасах гурткі па агразоатэхвучобе.

Да 1 сакавіка 1936 года падрыхтаваць і праверыць усю тэхнічную базу калгасаў і МТС. Калгасныя машыны і інвентар, глебаапрацоўчыя, пасеўныя, прапашныя, уборачныя і транспарт захоўваць у закрытым памяшканні.

Разгарнуць работу па павышэнню кваліфікацыі калгасных кадраў, стаханаўцаў і разгарнуць масавую прапаганду агразоатэхмерапрыемстваў.

Для стварэння жывёлепалепшаных выпасаў да 15 мая 1936 г. ачысціць выпасы ад хмызняку, куп'я, моху шляхам баранавання, спуску вады на забалочаных участках, забараніўшы арань выпасы пад пахаць.

У мэтах вылучэння жанчын-калгасніц на кіруючую калгасную работу прапусціць праз калгасныя школы ў 1936 г. у кожным раёне па 100—150 жанчын.

Мы заклікаем усе раёны, сельскія саветы, калгасы, брыгады і ўсіх калгаснікаў БССР абмеркаваць у сябе пытанні ўздыму ўраджайнасці і дабіцца ў 1936 годзе, каб БССР заняла першае месца па ўраджайнасці ў нячорназёмнай паласе.

Арганізаваць акруговае спаборніцтва калгасаў, МТС і раёнаў за выкананне прынятых намі абавязацельстваў, за перадавое месца нашай акругі ў БССР.

Выклікаць на соцспаборніцтва Лепельскую акругу.

Для заключэння ўмовы выбраць камісію ў складзе: тт. Грышанава, Тачыла ад Полацкага раёна, Качэва ад Расонскага раёна, Папкова ад Ветрынскага раёна, Цяста Сяргея ад Дрысенскага раёна і Пудава ад Асвейскага раёна.

Мы ўпэўнены, што пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі з гэтымі задачамі ў 1936 г. справімся, дамо высокі ўраджай, датэрмінова выканаем загатоўкі і забяспечым на працадзень калгаснікам не менш 5 кгр. збожжа, 10 кгр. бульбы і 2 рублі грашыма.

Няхай жыве стаханаўскі рух!

Няхай жыве КП(б)Б і яе кіраўнік таварыш **Гікало!**

Няхай жыве Ўсесаюзная Комуністычная партыя (большэвікоў)!

Няхай жыве наш любімы правадыр таварыш **Сталін!**

ЧАРГОВАЕ СКАЖЭННЕ ФАКТАЎ КВАНТУНСКІМ ШТАБАМ

ТОКІО, 7 студзеня. (БЕЛТА). Усе японскія газеты прыводзяць паведамленне чанчуньскага карэспандэнта агенцтва «Домей цусін» аб тым, што «шэсць совецкіх конных салдат 28 снежня ўварваліся на тэрыторыю Манчжоу-Го каля ўзгорка на ўсход Янмулінцзы — на ўсходняй граніцы Манчжоу-Го — і, паводле сцвярджэння канюніке, апублікаванага квантунскай арміяй 6 студзеня, увялі на совецкую тэрыторыю 26 манчжур і 6 коней». Месца, адкуль уведзены манчжуры, — гаворыцца ў камюніке, — «безумоўна з'яўляецца тэрыторыяй Манчжоу-Го».

***

ТАСС упаўнаважан заявіць, што вышэйпрыведзенае паведамленне штаба квантунскай арміі з'яўляецца як гэта ўжо мела месца неаднаразова ў мінулым, заведамым і грубым скажэннем сапраўдных фактаў.

На самой справе, як гэта дакладна ўстаноўлена расследваннем, мела месца наступнае.

28 снежня мінулага года 26 манчжурскіх лесарубаў, па заданню падрадчыка, які загатаўляе лес для японскага гарнізона, размешчанага ў Банцзяху, перайшлі граніцу ў раёне паміж пагранічнымі знакамі №№ 23 і 24 (на паўднёвы захад од Тур'яга Рога) і прыступілі да парубкі совецкага лесу ў вярхоўях Падзі Шэрэмецева, углыбіўшыся на тэрыторыю СССР да паўтара кіламетра. Драпежнікі паспелі вырубіць значную колькасць лесу, калі былі выяўлены і затрыманы вартавым нарадам нашай пагранічнай аховы. Затрыманыя дастаўлены ў пагранічную камендатуру для правядзення расследвання.

Згодна дадатковых вестак, атрыманых ТАСС'ем, 4 студзеня ў раёне парубкі з'явіўся ўзброены япона-манчжурскі атрад у 15 чалавек, які парушыў граніцу і паглыбіўся на тэрыторыю СССР на 300 метраў. Заўважыўшы наряд нашай пагранічнай аховы, які знаходзіўся ў аддаленні, япона-манчжурскі атрад неадкладна вярнуўся на манчжурскую тэрыторыю.

Такім чынам, квантунскаму штабу не можа не быць вядома, што затрыманне парубшчыкаў адбылося на совецкай тэрыторыі, і змешчаныя ў яго камюніке сцвярджэнні заведама вымышлены.

ЯПОНСКАЯ АГРЭСІЯ Ў ПАЎНОЧНЫМ КІТАІ

ТОКІО, 8 студзеня, (БЕЛТА). Цяньцзінскі карэспандэнт «Ніцініці» паведамляе, што падрабязнасці інцыдэнта з «зневажэннем японскага флага» ў Таку 2 студзеня ўжо высветлены японскімі ўладамі. Пры гэтым, паводле слоў карэспандэнта, ўстаноўлена, што салдаты арміі Сун Чжэ-юаня «разграбілі некалькі японскіх магазінаў у Таку і сарвалі японскі флаг з аднаго з японскіх дамоў». Пасля гэтага інцыдэнта,—указвае карэспандэнт, — адпаведныя японскія колы вынеслі рашэнне прыняць асобыя меры па ахове японскіх рэзідэнтаў у раёне Таку, нават у выпадку атрымання ў сувязі з інцыдэнтам поўнага задавальнення ад кітайскіх улад.

ІНТЭРВЮ ПРАДСТАЎНІКА ЯПОНСКАГА МІНІСТЭРСТВА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ

ТОКІО, 6 студзеня. (ТАСС). Адказваючы на пытанні замежных карэспандэнтаў адносна заключэння ваенна-палітычнай згоды паміж Германіяй і Японіяй у Берліне, прадстаўнік японскага міністэрства замежных спраў сёння сказаў, што «палобныя паведамленні пазбаўлены ўсякай падставы», і дадаў, што гэтыя весткі з'яўляліся толькі ў совецкім друку.

***

Калі прадстаўнік японскага міністэрства замежных спраў на гэты раз пропуліе «шчырасць», то ў яго заяве можна толькі ўгледзець пацвярджэнне правільнасці ранейшых паведамленняў ТАСС з Лондана, атрыманых з усім даставерных крыніц. У гэтых паведамленнях указвалася, што японская ваенчыны вядзе перагаворы аб ваенным саюзе з прадстаўнікамі германскага рэйхсвера праз японскага ваеннага атташэ ў Берліне за спіной японскага міністэрства замежных спраў.

АНТЫЯПОНСКІ РУХ У КІТАІ

ШАНХАЙ, 8 студзеня. (БЕЛТА). Учора ў Нанкіне адбылася антыяпонская дэманстрацыя, у якой прымала ўдзел 3 тысячы студэнтаў. Па трэбаванню японцаў, японскае генеральнае консульства ахоўвалася ўзмоцненымі атрадамі паліцыі.

Паміж студэнтамі Учана, Ханькоу і Ханьяна (Хубэй) і паліцыяй адбылася схватка на станцыі Інчэн (75 клм. на паўночны захад ад Ханькоу), у выніку чаго з боку студэнтаў ёсць зафіры.

Студэнцкія прадстаўнікі патрэбавалі ад хубэйскага ўрада пакараць вінаватых, кампенсаваць пацярпеўшых і пабудаваць на месцы сутычкі помнік для ўвекавечання антыяпонскага руху. Кантонскія студэнты праходзяць ваенную падрыхтоўку. 4 тысячы служачых урадавых устаноў у правінцыі Гуандун пачалі ваеннае абучэнне па падрыхтоўцы каманднага састава, які «можа ў любы момант спатрэбіцца для барацьбы са знешнім ворагам».

АНГЛА-ФРАНЦУЗСКІЯ ПЕРАГАВОРЫ

БЕРЛІН, 8 студзеня. (БЕЛТА). Увесь германскі друк па-ранейшаму выражае трывогу адносна перагавораў паміж прадстаўнікамі англійскага і французскага генеральных штабаў, сцвярджаючы ў паведамленнях з Парыжа, што перагаворы прывялі к дагавору аб ваенным супрацоўніцтве паміж Англіяй і Францыяй.

Блізкая к Герынгу эсэнская «Нацыяналь-пэйтунг» вышла пад аншлагам: «Тайны дагавор, не гледзячы на Локарно». Газета заяўляе, што дагавор аб «ваенным супрацоўніцтве» паміж Англіяй і Францыяй азначае «расшырэнне сяродземнаморскага канфлікту да Рэйна».

***

ЛОНДАН, 8 студзеня. (БЕЛТА). Згодна паведамлення газеты «Морнінг пост», у Лондане прызнаюць, што прадстаўнікамі англійскага і французскага генеральных штабаў выпрацаван шырокі план узаемнай дапамогі Англіі і Францыі. Падрабязнасці плана невядомы.

***

ЛОНДАН, 8 студзеня. (БЕЛТА). У палітычных колах вялікае ўражанне зрабіла апублікаванне паведамлення, што першая і другая эскадры англійскага флота будуць крэйсіраваць у Сяродземным моры, калі ў Жэневе будзе абмяркоўвацца пытанне аб забароне паставак нафты ў Італію. Англійскае адміралтэйства таксама абвясціла сёння аб пасылцы розных караблёў у Сяродземнае мора. Шырока распаўсюджана думка, што перасоўванне караблёў робіцца ў выніку гутарак паміж англійскімі і французскімі ваенна-марскімі экспертамі.

ВАЙНА Ў АБІСІНІІ

ГАЗАВЫЯ АТАКІ

ВЕНА, 8 студзеня. (БЕЛТА). Агенцтва «Юнайтэд прэс» паведамляе з Харара, што італьянцы перайшлі на ўсіх франтах к шырокаму прымяненню газавай вайны. Асабліва многа газавых бомб скідаецца ў раёнах на поўдзень ад Макале. Агульная колькасць газавых бомб, скінутых за першыя дні студзеня, дасягае 10 тысяч.

ІТАЛЬЯНЦЫ РЫХТУЮЦЦА ДА НОВАГА НАСТУПЛЕННЯ

ВЕНА, 8 студзеня (БЕЛТА) Паведамляючы аб адпраўцы ў Абісінію раду новых італьянскіх часцей, агенцтва «Тэлеграфен компані» адзначае, што гэта тэрміновая адпраўка звязана з тым, што ў Абісінію прыбліжаецца перыяд дажджоў, і італьянскае камандаванне, відаць, прыняло рашэнне яшчэ да наступлення гэтага перыяда вярнуць захваченую ў першыя месяцы вайны абісінскую тэрыторыю, часткова адбітую абісінцамі.

АПОШНЯЕ ПІСЬМО РУДОЛЬФА КЛАЎСА

Пакараны смерцю 17 снежня 1935 года ў Берліне фашыстамі германскі комуніст тав. Рудольф Клаўс праявіў выключную мужнасць, цвёрдасць духу і непахіснасць і ў зняволенні, і на судзе, і перад карай.

Хворы, змучаны катаваннямі, на працягу некалькіх месяцаў перажыўшы ўсе жахі фашыстскай турмы, рэволюцыянер знаходзіў у сабе даволі цвёрдасці, каб пісаць падбадзёрваючыя пісьмы сваякам і прыяцелям.

У адным з апошніх сваіх пісем, пераданых тайком на волю, тав. Клаўс, апісваючы тыя пакуты, якія яму прыходзіцца вытрымліваць адначасова дадае: «Але за свае пераконанні можна перанесці ўсё, што ўгодна».

(«Правда»)

Кур'янаў Сцяпан — стаханавец полацкага шпалярэннага завода ўстанавіў новы ўсесаюзны рэкорд па шпалярэзцы, даўшы 1.105 шпал за змену, замест ранейшага рэкорду 684 шпалы. НА ЗДЫМКУ: Сцяпан Кур'янаў. Фото КАПЛІНСКАГА.

СТАХАНАЎЦЫ ХЛЕБАПЯЧЭННЯ НА ПРЫЕМЕ Ў СТАРШЫНІ СОЎНАРКОМА БССР ТАВ. ГАЛАДЗЕДА

Учора старшыня СНК БССР таварыш Галадзед прыняў дэлегацыю стаханаўцаў хлебапякарнай прамысловасці БССР. На прыёме прысутнічала 88 чал. Сярод іх—стаханаўцы, дырэктары заводаў, сакратары парткомаў, старшыні заўкомаў, нарком унутранога гандлю тав. Гурэвіч, старшыня ЦП саюза рабочых хлебапякарнай прамысловасці тав. Паршуноў.

Дырэктар трэста Белпрамхлеб тав. Барзуноў расказаў таварышу Галадзеду аб дасягненнях хлебазаводаў, павелічэнні асартыменту хлебна-булачных вырабаў, аб шырокім разгортванні стаханаўскага руху на прадпрыемствах хлебапячэння.

Стаханаўцы-пекары **Шчадрынскі, Навіцкі і Кухарэнка** расказалі аб сваёй рабоце, аб тым, як яны дабіліся высокай прадукцыйнасці працы і высокага заработку.

У канцы гутаркі з прамовай выступіў таварыш **ГАЛАДЗЕД.** Ён паставіў перад стаханаўцамі і кіраўнікамі хлебапякарнай прамысловасці рад практычных задач па далейшаму паляпшэнню якасці выпякаемага хлеба.

Стаханаўцы запэўнілі таварыша **Галадзеда,** што ўказанні партыі і ўрада яны з гонарам выканаюць. (БЕЛТА).

Стаханаўскія суткі і пяціднеўкі

Учора на скурана-галантарэйнай фабрыцы імя Куйбышэва праведзены стаханаўскія суткі. За першую змену фабрыка выканала план на 140 проц. Паасобныя цэхі (футлярны, чэмаданны) выканалі зменнае заданне на 137—143 процантаў.

У першай палове дня паасобныя стаханаўцы і цэлыя брыгады выканалі зменную норму. Работніцы дамскіх сумак **Башкова, Бумар, Ратнер, Токарская, Аніфатар, Хоміч** і інш. за першыя 2—3 гадзіны выканалі зменную норму на 109—150 процантаў.

Вядучая роля ў стаханаўскай змене была за комуністамі і комсамольцамі, якія паказалі ўзоры высокай прадукцыйнасці працы і павялі за сабой усю масу рабочых. Парторг сталярнага цэха т. Гамер і прафорг, комуніст Плімак за тры гадзіны работы выканалі сваю дзенную норму на 250 процантаў. Комуністы Эльтэрман і Матусевіч за 3 гадзіны работы выканалі дзенны план на 100 процантаў.

ДЫНЕРШТЭЙН.

***

8 студзеня ў менскім паравозным дэпо пачалася першая стаханаўская пяціднеўка. У першы-ж дзень работы токар-стаханавец **Яромка** выканаў дзенны план на 259,9 процантаў, токар комсамолец **Гладкі** — на 195 процантаў. Рабочыя абточнага цэха абавязаліся за гэту пяціднеўку выпусціць з рамонту 1 паравоз замест планавых 7 дзён.

Н. СТРЭЛЬЧАНКА.
З. СЛАВІН.

ПРЭМІРАВАННЕ ПЕРАДАВІКОЎ УСЕСАЮЗНАГА КОНКУРСА НА ПАСТАЎКУ ДЗЯРЖАВЕ ВЫСОКАЯКАСНАГА ЗЯРНА

Цэнтральная камісія пад старшынством тав. **Калініна Міхаіла Іванавіча** падвяла вынікі ўсесаюзнага конкурса на пастаўку дзяржаве высокаякаснага зярна. У пастанове камісіі адзначаецца, што конкурс, праведзены «Крестьянской газетой», Наркамземам СССР і камітэтам па загатоўках сельскагаспадарчай прадукцыі, ахапіў у 1935 годзе ўсе рэспублікі, краі і вобласці саюза. «Конкурс адыграў вялікую ролю ў дасягненні высокіх ураджаяў, у паляпшэнні якасці зярна і датэрміновым выкананні хлебапаставак дзяржаве. Многія калгасы, якія ўдзельнічалі ў конкурсе, дасягнулі ўраджаю зернавых культур ад 20 да 38 цэнтнераў з гектара і здалі дзяржаве зярно высокай якасці».

Цэнтральная конкурсная камісія прэміравала больш 250 перадавых калгасаў, іх старшынь, брыгадзіраў, калгаснікаў, селькораў і рэдактароў раённых, абласных і краявых газет. Калгасы прэміраваны грузавымі і легкавымі машынамі, абсталяваннем для хат-лабараторый і палявога стана; старшыні калгасаў, брыгадзіры, калгаснікі-ўдарнікі, селькоры і рэдактары — веласіпедамі, фотаапаратамі, мэбляй для кватэр, легкавымі машынамі і інш.

Па БССР прэміраваны:

Калгас **«10 з'езд советаў»,** Аршанскага раёна — грузавым аўтамабілем. Старшыня калгаса **т. Шэстоўскі,** брыгадзір **т. Вайцэхоўскі А. Л.** і рэдактар калгаснай насценнай газеты **т. Белкін А.** — веласіпедамі.

Калгас **«12-годдзе Кастрычніцкай рэволюцыі»,** Чырвонаслабодскага раёна — грузавым аўтамабілем. Старшыня калгаса **т. Рэус**—1.000 р. на мэблю для кватэры, брыгадзір другой брыгады **т. Перэсоляк Г. Я.** — веласіпедам, калгасніца **т. Куцько О. М.** — патэфонам.

Калгас **«Чырвоная ніва»,** Церахоўскага раёна,—абсталяваннем для хаты-лабараторыі, старшыня калгаса тав. **Брэхунцова** — веласіпедам.

Рэдактар газеты **«Звязда»** **т. Стэрнін** — фотаапаратам «Лейка».

Рэдактар аршанскай раённай газеты **т. Дамарацкі** — фотаапаратам «Лейка».

Яшчэ раз аб унутрыпартыйнай дэмакратыі

... Кіруючым прынцыпам арганізацыйнай пабудовы партыі з'яўляецца дэмакратычны цэнтралізм, азначаючы:

а) выбарнасць усіх кіруючых органаў партыі з верху да нізу;

б) перыядычную справаздачнасць партыйных органаў перад сваімі партыйнымі арганізацыямі... (статут ВКП(б).

Пасля чысткі партыі 1933 года партыйная арганізацыя Беларускага дзяржаўнага універсітэта выбрала партыйны камітэт з 7 членаў. Сакратаром парткома быў выбран тав. Лемец.

Прайшло нямнога часу і замест выбыўшага члена парткома, дырэктара БДУ Ермакова, у склад парткома быў кааптаваны новы дырэктар — Дзякаў. З пачатку навучальнага 1934—35 г. партком на сваім пасяджэнні вызваляе ад абавязкаў члена парткома Дэрбанпова, «з-за перагружанасці», і замест яго кааптуецца Працэнка.

17 студзеня 1935 года на пасяджэнні парткома «слухалі аб кааптацыі ў члены парткома комуніста Адзінцова. Пастанавілі «кааптаваць».

25 лютага 1935 г. зноў у парадку дня парткома пытанне аб кааптацыі. У пратаколе запісана: «Слухалі: аб кааптацыі членаў парткома. Пастанавілі: кааптаваць Шыфрыну і Арашкевіча».

Члены парткома выбывалі з такой-жа хуткасцю, з якой лёгкасцю і быстрынёй яны ўводзіліся ў склад парткома пасяджэннем апошняга. Арашкевіча прышлося неўзабаве вывесці са складу парткома ў сувязі з выяўленымі матэрыяламі пры праверцы партдакументаў. Быў выведзен са складу парткома Рогаў і іншыя.

Вось такая чэхарда з кааптацыяй у парткоме БДУ пягнецца два гады з лішнім. З старога складу парткома, выбранага ў 1933 годзе, застаўся толькі адзін Гузей. За гэты час некалькі раз змяняўся склад парткома і заўсёды без ведама комуністаў, якіх у калектыве БДУ больш сотні. Кааптавалі, забываючы статут партыі, парушаючы арганізацыйныя прынцыпы пабудовы нашай партыі.

Ад безупыннай кааптацыі ў парткомшчыкаў БДУ так ускружылася галава, што нават не заўважылі і нідзе не адзначылі, як і калі членам парткома стаў выкладчык Карнейчык. Ніхто не ведае, калі яго ўводзілі ў склад парткома. Ён сам урос у партком. Але яго таксама прышлося вывесці за дапушчаныя палітычныя памылкі.

Выбіраліся толькі сакратары. Тут перад намі таксама цікавы дакумент. З пратакола агульнага схода партыйнай арганізацыі БДУ ад 14 студзеня 1935 года відаць, што ў парадку дня схода стаяла пытанне аб выбары сакратаром парткома Працэнка. Але ці выбіралі Працэнка і хто выбіраў, у пратаколе не відаць.

Не лепш і з справаздачнасцю парткома. Больш года прапавў сакратаром Лемец. Ён пакінуў гэту работу, ніразу не адчытаўшыся перад партыйнай арганізацыяй за работу парткома. Не адчытваўся партыйны камітэт за сваю работу і да сённяшняга дня. Калі не лічыць дакладаў аб становішчы работы партыйнай арганізацыі пры прапрапоўцы пастановы пленума Ленінградскага гаркома ВКП(б) і пры праверцы партдакументаў, то перыядычнай справаздачы парткома не было.

Не было справаздач і парторгаў. Справаздачы парторгаў слухаліся толькі тады, калі з'яўлялася неабходнасць змены аднаго парторга другім. Толькі зараз у плане работы партарганізацыі намечаны справаздачы парторгаў у групах.

На працягу двух з лішнім гадоў кіраўнікі партарганізацыі БДУ груба скажалі статут партыі. Яны парушалі ўнутрыпартыйную дэмакратыю.

Партыйная арганізацыя, комуністы парткомам груба ігнараваліся, зводзіліся да простых назіральнікаў.

Ц. ФРЫД.

Партыйная гаспадарка ў справах сельсовета

У пярвічнай партыйнай арганізацыі Княжыцкага сельсовета і зараз пануе хаос у партыйнай гаспадарцы. Партыйныя дакументы, пратаколы, сакрэтная перапіска хаваюцца ў адкрытым стале сакратара сельсовета. Яго парторг Гарбацкі зрабіў тэхнічным сакратаром партгрупы і даверыў хаванне партыйных дакументаў. Пратаколы, перапіска в райкомам партыі не падшыты, раскіданы.

Калі мы папрасілі паказаць нам партыйныя справы, комуніст Жураўлёў (старшыня сельсовета), не даведаўшыся хто мы такія, з ахвотай дастаў у стале сакратара сельсовета партыйныя справы і падаў нам. У такім-жа стане і ўнясенне членскіх узносаў.

Кандыдат партыі з 1931 года т. Будрык на працягу 7 месяцаў не ўносіў членскіх партыйных узносаў. Член партыі з 1919 года Пазнякевіч не ўнёс партыйных узносаў за 4 месяцы.

Праўда, парторг Гарбацкі новы чалавек у гэтай арганізацыі, яго толькі некалькі тыдняў назад выбралі парторгам. Але за гэты перыяд ён меў поўную магчымасць упарадкаваць партыйную гаспадарку.

Віну за такія безадказныя адносіны да хавання партыйных дакументаў у княжыцкай партыйнай арганізацыі нясе таксама і інструктар райкома партыі т. Гарбуноў. Ён гэтай справай не цікавіўся, як і наогул работай партгрупы.

Снежаньскі пленум ЦК ВКП(б) абавязаў усе партыйныя арганізацыі ўсвоіць да канца ўрокі праверкі партдакументаў і паклаці канец усім тым агіднасцям, якія былі выкрыты ў працэсе праверкі. Партыйная група Княжыцкага сельсовета гэтых урокаў не ўлічыла.

ЗІСКІНД.

АДКАЗ пану РЫБЕНТРОПУ

Інтэрв'ю, данае тав. Г. Дзімітравым прадстаўнікам друку

У фашысцкай газеце «Фелькішэр беобахтэр» ад 18 снежня 1935 года «асоба ўпаўнаважаны» Гітлера па пытаннях знешняй палітыкі фон-Рыбентроп змясціў пісьмо англійскаму палітыку лорду Алену оф Хартвуд у адказ на адрасаванае праз яго пасярэдніцтва асабіста Гітлеру патрабаванне англійскіх юрыстаў вызваліць германскага адваката Ганса Літэна.

У гэтым пісьме Рыбентроп высоўвае рад тэзісаў: першы, што цяперашні германскі рэжым прадстаўляе сабой асобую прававую сістэму, адпавядаючую «духу» і «натуральным пачуццям» германскага народу; другі, што прыход германскіх фашыстаў 30 студзеня 1933 года да ўлады з'яўляецца «рэволюцыяй»; трэці, што гістарычнай місіяй германскага фашызма з'яўляецца выратаванне цывілізацыі, і, нарэшце, чацверты, што ён, Рыбентроп, садзейнічаў вызваленню Дзімітрава, у чым ён цяпер горка каецца.

Рыбентроп выказвае жаль з поваду таго, што германскі ўрад праявіў «вялікадушша», вызваліўшы ў свой час Дзімітрава.

Спасылаўшыся на даклад таварыша Дзімітрава на VII кангрэсе Комуністычнага Інтэрнацыянала, які пан Рыбентроп агідна скажае, ён піша: «Гэта старанна распрацаваная праграма з'яўляецца рэзультатам вызвалення Дзімітрава, г. зн. рэзультатам ліберальнага брытанскага светапогляду і германскай дабрадушнасці і вялікадушша».

Ніжэй мы змяшчаем адказ таварыша Дзімітрава на пытанні прадстаўнікоў друку, якія звярнуліся да яго з поваду гэтага.

* * *

Пытанне. Якая ваша думка аб пісьме гітлераўскага дыпламата Рыбентропа да англійскага лорда Алена, пісьме, апублікаваным у афіцыяльным органе германскага ўрада «Фелькішэр беобахтэр» ад 18 снежня ў адказ на адрасаванае асабіста Гітлеру патрабаванне англійскіх юрыстаў аб вызваленні нямецкага адваката Літэна?

Дзімітраў. П. Рыбентроп не выступае ад свайго асабістага імя. Асабістыя думкі Рыбентропа маюць мала цаны. Пісьмо Рыбентропа — гэта афіцыяльная заява германскага ўрада, які прабуе апраўдаць страшэнныя злодзеянні, узняўшыя хвалю пратэстаў ва ўсім цывілізаваным свеце. Вуснамі Рыбентропа гаворыць раз'юшаны германскі фашызм, які імкнецца знайсці падтрымку грамадскай думкі Англіі як у справе расправы з палітычнымі праціўнікамі фашызма, так і для сваіх авантурыстычных ваенных планаў. Не выпадкова гэта пісьмо паяўляецца ў той момант, калі чэсныя людзі ва ўсім свеце ахоплены абурэннем з поваду подлай кары смерцю нямецкага комуніста Клаўса і калі перад тварам катастрофы голаду, у якую фашызм кінуў прапоўныя масы Германіі, германскія фашысты ўзмацняюць небывалы тэрор па ўсёй краіне. Выступаючы адкрыта ў абарону катаў, арудуючых сякерай, іх суддзьлнік у лайкавых пальчатках дыпламата па сутнасці справы сваім пісьмом кідае выклік усёй сусветнай грамадскай думцы.

Пытанне. Што вы думаеце з поваду цверджання Рыбентропа, што цяперашні германскі рэжым прадстаўляе асобую прававую сістэму, адпавядаючую «духу» і «натуральным пачуццям» нямецкага народу?».

Дзімітраў. Гэта цверджанне Рыбентропа з'яўляецца самай цяжкай знявагай вялікага нямецкага народу. Якім цынізмам трэба ўладаць і з якой «ніпшэанскай» пагардай трэба адносіцца да людзей, якім непасрэдна адрасавана пісьмо Рыбентропа, каб выступіць з такога роду цверджаннем. Фашызм і прававая сістэма—даве рэчы, зусім несумяшчальныя. Фашызм з'яўляецца адмаўленнем якога-б там ні было прававога парадку. Фашызм — гэта па сутнасці свавольства. Гэта свавольства ўзброенай банды наймітаў буйнага капітала, закабаляючых пераважную большасць народу ў інтарэсах не толькі наогул эксплааататарскай меншасці, але як раз найбольш драпежніцкіх эксплаатэтараў.

Што гэта за прававая сістэма, пры гэтым адказваючая «духу» і «натуральным пачуццям» нямецкага народу, якая дзевяць дзесятых гэтага народу пазбавіла элементарных палітычных праў? Што гэта за прававая сістэма, якая ў турмах і канцэнтрацыйных лагерах, знішчае цвет нямецкага народу? Што гэта за прававая сістэма, пры якой, па словах самога Рыбентропа, трымаюць у зняволенні ні ў чым не вінаватых людзей, як Літэна, толькі таму, што ў іх іншая, чым у п. Рыбентропа, «духоўная ўстаноўка»? Рыбентроп угрунтоўвае неабходнасць адмены ў Германіі старога прававога парадку тым, што па яго словах, «і Адольфа Гітлера можна было-б судзіць па тых-жа параграфах» крымінальнага ўкладу, што і іншых смертных. Але такая сістэма, пры якой любы фашысцкі забойца за свае зладзействы не падлягае ніякаму суду і ніякім параграфам, — гэта і ёсць сістэма свавольства. Гэта — рэжым кіруючай крымінальшчыны.

Не будзе перапавелічэннем сказаць, што «асобая прававая сістэма» Рыбентропа бліжэй стаіць да «сістэмы» амерыканскіх гангстэраў, якія тэрарызуюць насельніцтва Злучаных штатаў Амерыкі, чым да якой-бы там ні было існуючай прававой сістэмы. Пад якую прававую сістэму, напрыклад, можна падвесці правакацыйны падпал германскімі фашыстамі рэйхстага? Няхай папрабуе уніфікаваная нямецкая Акадэмія права, матэрыялы якой п. Рыбентроп пераграджальна абяцае перасланць лорду Алену, угрунтаваць пад кутом гледжання прававой сістэмы гэты праваакцыйны акт, які паслужыў па плану яго ініцыятараў поводам для цэлага раду варфаламееўскіх начэй. Няхай «прававой сістэмы» Рыбентропы не здолеюць угрунтаваць такога кроку, як арышт зусім непрычасных людзей і суд над імі па абвінавачанню іх у падпале рэйхстага, тады як увесь свет ведае, што рэйхстаг быў падпален па заданню і пад кіраўніцтвам фашысцкіх уладу маючых.

Няхай папрабуе нямецкая Акадэмія права юрыдычна ўгрунтаваць так часта практыкуемыя фашыстамі забойствы з-за вугла або шматлікія выпадкі забойстваў пры так званай «спробе да ўцякання», ці смяротныя прыгаворы антыфашыстам на аснове фальсіфікаваных дакументаў і падстаўных сведак. Няхай папрабуе яна апраўдаць сістэму катаванняў і інквізіцыі, якім фашысцкія каты падвяргаюць зняволеных комуністаў, соцыял-дэмакратаў і іншых антыфашыстаў. Няхай п. Рыбентроп растлумачыць, у якія нормы прававой сістэмы ўкладаюцца такія дзеянні, як забойства фашыстам на чэхаславацкай тэрыторыі нямецкага прафесара Лесінга, як крывавая разня 30 чэрвеня, як забойства генерала Шлейхера і яго жонкі, як расстрэл дзесяткаў штурмавікоў? А антысеміцкія пагромы і праследванні католікаў, напамінаючыя горшыя старонкі з часоў інквізіцыі, часоў гугенотаў? А сперылізацыя? Пры якой прававой сістэме дапушчальны такога роду агідныя акты? А вакханалія з публічным спальваннем бяссмертных твораў чалавечай мысліі і чалавечага генія?

Так, такая «асобая прававая сістэма» мела прапэлэнты ў гісторыі, у цёмным сярэдневякоўі; яна да гэтага часу выклікае жах у тых, хто вывучае гісторыю катаванняў, кастроў, спальванняў «ерэтыкоў», кары смерцю Джордано Бруно, зверскай «дыбы», на якую падымалі няшчасных людзей у часы Іоанна Грознага. І тады былі каты з сякерай на Лобным месцы, рубіўшыя галовы, і тады былі свае Рыбентропы, усхваляўшыя гэту «асобую прававую сістэму». Але вядома, што народы разбілі гэту сістэму ў прах, яны прагналі без жалю тых, хто быў посьбітам гэтай сістэмы. І патрэбны былі духоўнае выраджэнне буржуазнага грамадства і ўся гніль капіталіма, якая разлагаецца, каб зноў уваскрасіць гэту сістэму і зганьбіць краіну, якая дала свету Маркса і Энгельса, Гётэ, Шылера, Вагнера і Гейне. Суд гісторыі не будзе больш мяккім да тых, хто падняў у якасці сімвала сучаснага сярэдневякоўя плаху і сякеру ў эпоху, калі на шостай частцы земнага шара гарыць ужо пяцікавіковая зорка з эмблемай сярпа і молата.

Пытанне. Як вы расцэньваеце заяву Рыбентропа аб тым, што «рэволюцыі не рашаюцца ў судовых органах і ў адпаведнасці са звычайнымі прававымі нормамі»?

Дзімітраў. Зусім верна, што рэволюцыі не рашаюцца ні ў судовых залах, ні на аснове звычайных прававых норм. Але п. Рыбентроп, думаючы, што ён тут знайшоў ключ да апраўдання злодзеянняў нямецкага фашызма, упусціў адну «дробязь». У тым-то і справа, што прыход германскіх фашыстаў 30 студзеня 1933 г. да ўлады зусім не быў рэволюцыяй. Вядома, што ўсякая сапраўдная рэволюцыя азначае пераход улады ад аднаго класа ў рукі другога класа. У Германіі-ж буржуазія як клас знаходзілася і асталася ва ўладзе. Капіталістычная сістэма асталася някранутай. Змянілася тое, што поўныя гаспадарамі сталі самыя рэакцыйныя, самыя шавіністычныя і самыя імперыялістычныя колы фінансавага капітала, надавычайна ўзмацніўшыя капіталістычную эксплаатацыю і гнёт. Палітычны падлог не дапаможа Рыбентропу. Ён думае, што, наклеіўшы на фашысцкае рэакцыйнае шаленства слоўны ярлык «нацыянал-соцыялісцкай рэволюцыі», ён тым самым апраўдае фашысцкі тэрор. Фашысцкаму дыпламату неўдамёк, што сапраўдныя рэволюцыі не маюць патрэбы, як-бы суровы яны ні былі, у апраўданні, бо яны падымаюць народ, які робіць іх, а значыцца, чалавецтва ў цэлым на больш высокую ступень чалавецкай цывілізацыі. Фашысцкая-ж крывавая вакханалія таму і не можа быць апраўдана нічым, што яна спускае вялікі германскі народ на ступень варварства.

Фашысцкая легенда аб нацыянал-соцыялісцкай рэволюцыі была да гэтага часу пераважна прадметам для ўнутранога спажывання, які павінен увесці ў зман масы і замяніць ім нехапаючыя тлушчы, мяса і яйкі. Цяпер гітлераўскі коміваяжэр Рыбентроп прабуе выкінуць гэты гнілы тавар на еўрапейскія рынкі. Ён зусім сур'ёзна рэкамендуе фашысцкае шаленства, як «узор рэволюцыі» для ўсіх іншых народаў.

Нельга без усмешкі чытаць такога роду цверджанні Рыбентропа, як тое, што праславутыя метады нацыянал-соцыялісцкай рэволюцыі «не маюць нічога падобнага ў гісторыі» і «знаходзяцца ў абураючай супярэчнасці з жорсткімі варварскімі метадамі, пры дапамозе якіх праводзіліся рэволюцыі ў іншых народаў культурнага свету», што яны служаць справе «захавання этычных і маральных асноў народу». Усё гэта такія рэкорды бессаромнай хлусні, што адказваць на іх нават не прыходзіцца. Гэта сапраўды фашысцкі «ўзор» бязмежнай нахабнасці.

Пытанне. Як вы адносіцеся да заявы Рыбентропа аб тым, што гістарычнай місіяй нямецкага фашызма з'яўляецца выратаванне цывілізацыі?

Дзімітраў. Таксама, як адносіся-б да заявы амерыканскіх гангстэраў, калі-б яны прыпісалі сабе місію ратаваць чалавецтва ад бандытызма. Як вядома, германскія фашысты накіроўваюць свае ўдары супроць усяго таго, што носіць на сабе пячатку чалавецкага прагрэсу, свабоднай мысліі, незалежнай творчасці, супроць усіх тых, хто не з'яўляецца фашыстам. Ды інакш і быць не можа, бо фашызм — самы бязлітасны вораг чалавецкага прагрэсу і цывілізацыі, ён — увасабленне самага дзікага, раз'юшанага мракабесся. Ён накіроўвае свае ўдары ў першую чаргу супроць рабочага руху і ў асаблівасці супроць комунізма, бо комунізм прадстаўляе сабою авангард сусветнага рабочага руху, бо ён з'яўляецца носьбітам новай цывілізацыі, бо комунізм, як правільна сказаў нядаўна вядомы французскі пісьменнік Андрэ Жыд, «з'яўляецца агульнай справай народаў усяго свету».

І гэта роля комунізма асабліва ярка выступае ў святле тых найвялікшых дасягненняў соцыялістычнага будаўніцтва, якія ажыццёўлены ў СССР пад мудрым кіраўніцтвам найвялікшага чалавека нашай эпохі — Сталіна. Мільёны людзей — і рабочых, і сялян, і інтэлігентаў, вучоных, інжынераў, тэхнікаў, — у капіталістычным свеце ўсё больш пераконваюцца ў тым, што соцыялізм у СССР — гэта магутны рост прадукцыйных сіл, гэта добрабыт найшырэйшых народных мас, які безупынна паляпшаецца, гэта небывалы ўздым іх культурнасці, гэта ўсебаковае развіццё чалавечай асобы, гэта нараджэнне новага чалавека, новага быту, новай псіхалогіі. Соцыялізм — гэта мір і брацтва народаў. І іменна таму ўсё, што ёсць чэснага, незалежнага і свабоднага сярод чалавецтва, не гледзячы на ўсе труднасці, згуртоўваецца разам з рабочым класам у адзіны фронт супроць фашызма, гэтай чумы сучаснага чалавецтва.

Пытанне. Што вы скажаце адносна цверджання Рыбентропа, што ён садзейнічаў вашаму вызваленню?

Дзімітраў. Робячы такую заяву, Рыбентроп, мякка кажучы, перапавялічвае ролю сваёй асобы ў гісторыі. Як усе ведаюць, я і мае балгарскія таварышы былі вызвалены таму, што нават фашысцкі суд не мог не апраўдаць нас. А апраўдаў ён нас таму, што на лейпцыгскім працэсе было даказана з усёй відавочнасцю, што рэйхстаг падпальвалі не комуністы, а германскія фашысты. Нас вызвалілі таму, што хваля абурэння ўзнялася супроць злодзеяння германскага фашызма так высока ва ўсім свеце і фашызм так зганьбіў сябе і аскандаліўся ў Лейпцыгу, што яму нічога не засталася іншага, як выслаць нас. Але прычым-жа тут п. Рыбентроп? Калі-б Рыбентропы маглі мяне разарваць у Лейпцыгу, яны-б гэта зрабілі з вялікай прыемнасцю, але яны былі бяссільны. Бандыты, які выпускае сваю афяру, таму што яму скручваюць рукі прыбегшыя на дапамогу афяры- людзі, менш за ўсё можа хваліцца сваім вялікадушшам.

Рыбентроп імкнецца паказаць разгорнутую на VII кангрэсе адкрыта перад усім светам праграму адзінага фронта барацьбы супроць наступлення капітала, фашызма і вайны як сусветную тэрарыстычную змову не толькі супроць фашысцкай Германіі, але і ўсёй Еўропы і спецыяльна супроць Брытанскай імперыі. І аказваецца, што гэта жудасная бядота адбылася ў рэзультаце «англійскага ліберальнага светапогляду і нямецкай благадушнасці і вялікадушша», прывёўшых, як запэўняе Рыбентроп, да майго вызвалення. Уся гэта ілжывая галімацця патрэбна Рыбентропу для таго, каб пераканаць англійскую грамадскую думку не паўтараць такога роду «памылак», як маё вызваленне, для таго, каб развязаць рукі германскаму фашызму ў справе расправы над Тэльманам і іншымі зняволенымі ў германскіх гурмах. Ён свядома скажае рашэнні VII кангрэса, каб адцягнуць увагу ад сапраўдных змоўшчыкаў і тэрарыстаў, якія прабуюць упягнуць свет у катастрофу новай імперыялістычнай вайны. Стэнаграфічная справаздача майго даклада апублікавана, яе чыталі рабочыя ўсіх краін, яе могуць прачытаць таксама і англійскія лорды. У сваім дакладзе ў адпаведнасці з праграмай і тактыкай Комуністычнага Інтэрнацыянала я не толькі не выступаў у якасці прыхільніка індывідуальнага тэрору, а з усім запалам барацьбіта комунізма змагаўся супроць тых, хто зброю палітычнага індывідуальнага тэрору зрабіў асноўным метадам дасягнення сваіх антынародных мэт. Я маю на ўвазе ў першую чаргу германскіх фашыстаў.

Няма сумнення, што над жыццём Тэльмана і дзесяткаў тысяч комуністаў, соцыял-дэмакратаў і іншых антыфашыстаў, зняволеных у германскіх турмах і канцэнтрацыйных лагерах, навісла больш, чым калі-б там ні было, сур'ёзная небяспека. Новыя злодзеянні фашызма на чарзе. Рука фашысцкіх катаў павінна быць адведзена. Слова за мільёнамі рабочых і ўсіх чэсных людзей. **(«Правда»).**

ПА ТОЙ БОК ГРАНІЦЫ

ПА ШПАЛЬТАХ ПОЛЬСКІХ ГАЗЕТ

«АБЛЯЦЕЛІ ПЯЛЁСТКІ, ДАГАРЭЛІ АГНІ»

«Дванаццаць. За люстравымі вокнамі ў белым аснежаным парку рвуцца ракеты. Сіні бенгальскі агонь асвятляе векавыя дрэвы, урываецца ў залы. Усе ўстаюць. У хрустальных бакалах іскрыцца віно».

Гэта — сустрэча новага года лепшымі стаханаўцамі «Красного треугольника», апісаная ў «Правде».

Балы ў тэатрах, клубах і на кватэрах — у Маскве, у Ленінградзе, Кіеве, Харкаве, Баку, Свердлоўску, — у сотнях совецкіх гарадоў. Балы ў калгасах. Карнавалы. Ёлкі.

Ну, а там, за чырвоным рубяжом?

У Варшаўскім ваяводстве ёсць мястэчка Цехацінак. Мястэчковая буржуазія і яе грамадскія арганізацыі таксама рыхтаваліся да сустрэчы новага года. Вось што расказвае пра гэта газета «Нур'эр польскі».

Прадстаўнікі цехацінскіх грамадскіх арганізацый на сходзе 12 снежня, па прапанове ксяндза Асота, прынялі пастанову:

«Прадстаўнікі мястэчка Цехацінак, маючы на ўвазе цяжкае матэрыяльнае становішча жыхароў, сярод якіх многа беспрацоўных, а адсюль — бедных сем'яў, каб не распальваць згаладалых, якія з зайздрасцю глядзяць на наладжанне карнавалаў і балаў, пастанаўляюць у 1936 годзе забараніць у мястэчку такія забавы».

Мястэчка Цехацінак — зусім не выключэнне ў Польшчы. Вось адно з шматлікіх паведамленняў польскіх газет. Вярэм яго з газеты «Палонія» ад 31 снежня 1935 года.

«Хваля масавых скарачэнняў рабочых у Дамброўскім басейне не спыняецца. Тры дні таму назад на сценах завода «Катажына» з'явілася аб'ява, што з 11 студзеня 163 рабочыя атрымаюць месячны «адпачынак» без захавання ўтрымання, а калі цяжкае становішча завода не зменіцца, то «водпуск» гэты будзе працягнуты».

Тая-ж газета «Палонія» паведамляе, што «ў большасці тэкстыльных фабрык Лодзі абвешчана з 1 студзеня 1936 года масавае скарачэнне рабочых».

Такіх масавых скарачэнняў, — дадае газета, — Лодзь не памятае з 1929 года.

Наладжанне балаў і карнавалаў у такіх умовах нагадвае «пір у часе чумы».

І недарма прадстаўнікі цехацінскай буржуазіі рашылі забараніць наладжанне балаў і карнавалаў на ўвесь 1936 год, «каб не распальваць згаладалых». Лепшага выхаду і не прыдумаеш!

«Абляцелі пялёсткі, дагарэлі агні...»

СТАНОВІШЧА ЯЎРЭЙСКАЙ БЕДНАТЫ Ў ПОЛЬШЧЫ

Газета «Наш пшеглёнд» б'е трывогу з прычыны ўсё больш павялічваючайся галечы яўрэйскай беднаты ў Польшчы. Характарызуючы ў адным з сваіх артыкулаў становішча яўрэйскіх бядняцкіх мас горада Лодзі, газета піша:

«Ужо амаль сем год большасць яўрэйскага насельніцтва Лодзі стогне пад цяжарам жудаснага эканамічнага крызісу. Пачынаючы з яўрэйскага рабочага, які гадамі пазбаўлен работы і ўсякіх крыніц існавання, крызіс усё больш б'е па рамесніках і дробных гандлярах. Абнішчанне развіваецца надзвычай хуткімі тэмпамі. Становішча яўрэйскай беднаты проста адчайнае, і не толькі няма ніякіх даных на яго паляпшэнне, але, наадварот — становішча будзе ўсё, больш пагаршацца. Без праўвелічэння можна сказаць, што палова яўрэйскага насельніцтва Лодзі пазбаўлена ўсякіх крыніц існавання і поўнасцю залежыць ад добрачынных таварыстваў, якія не ў сілах аказаць хоць-бы маленькую дапамогу ўсім адчуваючым у ёй патрэбу».

Газета далей указвае на тое, што галеча не вычэрпвае ўсіх бед і пакут, якія прыходзіцца перажываць яўрэйскаму бедняку.

За апошні час у Польшчы ўзмацняюцца антыяўрэйскія выступленні польскіх нацыяналістычных элементаў.

Як паведамляе львоўская газета «Хвиля», у час антыяўрэйскіх выступленняў польскіх нацыяналістычных студэнтаў у Львове ранена каля 20 яўрэяў. У радзе вітрын яўрэйскіх крам было пабіта шкло. Антыяўрэйскія выступленні адбыліся таксама ў пазнанскім і келецкім ваяводствах, дзе пагромшчыкі разбілі ўсе латкі дробных гандляроў. У Лодзі і Варшаве пагромшчыкі таксама прабавалі наладзіць пагромы, але ім быў аказан рашучы адпор з боку яўрэйскіх, а ў радзе выпадкаў і польскіх рабочых.

Як вядома, амаль за ўсіх вышэйшых навучальных установах Польшчы мелі месца крывавыя сутычкі паміж польскімі і яўрэйскімі студэнтамі.

Яўрэйскімі пагромамі польскі фашызм імкнецца разбіць адзінства польскіх і яўрэйскіх працоўных і паслабіць нарастаючую хвалю антыфашысцкага народнага руху.

ГІСТОРЫЯ АДНОЙ СКАРГІ

Не так даўно ў рэдакцыю прышла група былых выхаванцаў дзіцячых дамоў. Зараз яны студэнты менскага вучэбнага камбіната электрасувязі. Прышлі, каб расказаць аб сваіх крыўдах.

— Нас у вучэбным камбінаце 60 чалавек. Загадчыкі дзіцячых дамоў паслалі нас на вучобу, не забяспечыўшы вопраткай і абуткам. А тут, у камбінаце, таксама намі ніхто не цікавіцца. Не створаны ўмовы для вучобы.

Загадчыкі дзіцячых дамоў сёмкава-гарадзецкага (Заслаўскі раён—Бадроў), рыскаўскага (Журавіцкі раён — Разуменка), мсціслаўскага — Гуцін нячула, бяздушна аднесліся да выхаванцаў.

Бадроў паслаў 21 выхаванца на вучобу, не даўшы ім польтаў, бялізны, галош і інш. Гуцін выдаў будучым студэнтам кароткую, вузкую старую вопратку. Разуменка забяспечыў сваіх выпускнікоў курткамі для маленькіх дзяцей. Загадчык парыцкага дзіцячага дома Фрыдкіна адкрыта выказвала свае пачуцці «досыць аб вас клапаціцца, у мяне ёсць другія дзеці, якіх я павінна даглядаць».

Можна было чакаць, што дырэкцыя вучэбнага камбіната, комсамольская, профсаюзная арганізацыі аднясуцца да выхаванцаў з любоўю, акружаць павагай, створаць ім умовы для жыцця і вучобы. Аднак, і арганізацыі камбіната сустралі новых студэнтаў вельмі халодна. Пасялілі іх у незакончаны корпус інтэрната. Электрычнасці там не было. Газавыя лямпы ў большасці пакояў былі няспраўныя. Студэнты былі вымушаны самі шукаць дровы і паліць печы. У пакоях брудна і некультурна. На ложках хлопцаў можна было бачыць бульбу, лушпіны, пасуду.

Вольны час былых выхаванцаў не арганізоўвалі. Культурна-масавая работа была ў загоне.

Што дзіўнага, калі ў інтэрнаце сярод выхаванцаў мэлі месца факты п'янак, гуляння ў карты. Некаторыя пачалі куліганіць, а другія збіраліся ўцякаць, ніхто не паклапаціўся аб стварэнні таварыскай абстаноўкі для новых студэнтаў. Іх называлі «беспрытульнымі», «блатнымі».

Так сустрэлі ў камбінаце былых выхаванцаў дзіцячых дамоў. Можна зразумець, з якім настроем прышлі хлопцы ў рэдакцыю.

Рэдакцыя ўмяшалася ў гэту справу. Наркомасветы выклікаў да сябе загадчыкаў дзіцячых дамоў. Выяснілася, што яны мелі поўную магчымасць забяспечыць сваіх выпускнікоў усім неабходным. Не было толькі жадання і чуласці да выхаванцаў.

І вось, пасля адпаведнага націску, выхаванцы атрымалі як вопратку, так і абутак. Знайшлося ўсё патрэбнае.

Прышлося правесці вялікую работу ў камбінаце сувязі.

Варта было толькі дырэкцыі, комсамольскаму камітэту і профкому камбіната зацікавіцца вучобай і жыццём студэнтаў, як карціна рэзка змянілася к лепшаму. Зніклі гутаркі аб шкодных звычаях беспрытульнасці, аб немагчымасці іх выхавання. Знайшліся сярод выхаванцаў здольнасці і таленты, знайшліся ініцыятары і арганізатары карысных патрэбных пачынанняў.

Па ініцыятыве Полі Белаглазкі арганізован гурток ручной працы, у якім прымае ўдзел 26 дзяўчат. Поля сама кіруе гэтым гурткам.

Былыя выхаванцы Маеўскі, Курыльчык і іншыя гараць жаданнем стаць мастакамі. Яны арганізавалі гурток мастака. Дырэкцыя пашла ім насустрач. Прадставіла адпаведны пакой і выдала грошы на абсталяванне яго. Цяпер юныя мастакі ахвотна працуюць у гуртку. Малююць партрэты кіраўнікоў партыі і ўрада Маеўскі і Аўчыннікаў закончылі вялікі партрэт «Тав. Варашылаў на кані».

Разгарнуў работу і харавы гурток. Рэгулярна, раз у шасцідзенку, праводзяцца заняткі гуртка. Сярод удзельнікаў гуртка асабліва выдзяляюцца сваімі галасамі і выкананнем Цыля Цырульнікава, Соня Фельдман, Фруза Папкова, Таня Сярогіна і іншыя.

Выхаванец Відзон праяўляе вялікія здольнасці да музыкі. Кіраўнік харавога гуртка т. Стрыгельскі абавязаўся навучыць яго іграць на скрыпцы. І поспехі ўжо ёсць. Відзон у хуткім часе будзе выступаць на вечарах самадзейнасці, паказвае ўсе свае здольнасці. Не дрэнна арганізавана работа фізкультурнага гуртка (кіраўнік т. Ножнікаў). Асаблівую здольнасць праяўляюць Броня Тумілавіч, Соня Чумакова і Швабоўская.

Змянілася становішча інтэрната. Зроблен унутраны рамонт памяшкання. Праведзена электрычнасць. Былыя выхаванцы поўнасцю забяспечаны пасцельным прыладамі. Пакоі папоўнены абсталяваннем. У іх чыста, утульна, светла і прыгожа. За ўзорную чыстату і парадак дзяўчаты пакоя № 40 атрымалі прэмію. Зайдзіце ў пакоі №№ 13 і 9 (старараста Відзон) і вы ўбачыце тое-ж самае — чыста, прыгожа.

За кошт сродкаў камбіната выхаванцы наведваюць лазню. Арганізавалі дармовае падладжванне абутку і мыццё бялізны.

Культурна арганізаван і вольны час. Адны праводзяць гучную чытку газет і мастацкай літаратуры, другія — гуляюць у шахматы, трэція — граюць на музычных інструментах. У камбінаце ёсць свой добра абсталяваны клуб. Амаль кожную шасцідзенку дэманструюцца кінокарціны. Зараз адкрываецца пакой адпачынку. Тут студэнт весела і культурна правядзе вольны час.

Не пазнаць цяпер і былых «хуліганаў» і «бузацёраў» — Марова Аўчыннікава. Змянілася адносіны, іх акружылі любоўю і павагай, перавыхавалі людзей, яны сталі актыўнымі студэнтамі і добрымі таварышамі.

Цяпер таксама прыходзяць хлопцы і дзяўчаты ў рэдакцыю і кваляцца, што жывецца весела і добра.

А. ПАНЬКОЎ.

У БАБРУЙСКІМ ДОМЕ АДПАЧЫНКУ

(ПІСЬМО НАСТАЎНІКА)

У сувязі з зімовымі канікуламі ў школах многія настаўнікі і вучні паехалі ў дамы адпачынку. Я, у прыватнасці, паехаў у Бабруйскі дом адпачынку, якім загадвае **Соркін.**

У гэтым доме чамусьці на санітарнае і культурнае абслугоўванне вельмі мала зварачаюць увагі.

У палатах няма такіх рэчаў, як плявацельніцы, не хапае крэслаў. Адпачываючыя вымушаны сядзець на ложках. Асвятленне такое слабае, што немагчыма чытаць.

На ўвесь дом адпачынку ёсць толькі адна шахматная дошка. Лыжаў і пексаў зусім няма.

У палатах да ўсяго не выконваецца рэжым. Вячэры звычайна бываюць на 30—40 мінут пазней. Якасць іх дрэнная.

Такая пастаноўка работы ў доме адпачынку не задавальвае адпачываючых.

В. І. АСТРОЎСКІ.

АШУКАНЦЫ Ў ШАВЕЦКАЙ МАЙСТЭРНІ

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКА)

У аддаленні рамонтнай шавецкай майстэрні «Чырвоны абутнік», якое знаходзіцца пры калгасе імя Фалько (Грычанскі сельсавет, Менскага раёна), ашукваюць заказчыкаў.

За зданыя свіныя скуры майстэрня павінна рабіць новыя галоўкі да ботаў. Загадчык-жа майстэрні **Верабейчык** дае галоўкі з рознай старызны, падошвы кладзе з трох кавалкаў, а плату бярэ як за новы тавар. Апрача таго майстэрня не выконвае ўсёй той работы, за якую бярэ плату.

Так было са мной. Здаў я ў снежні 1935 г. старыя халявы і дагаварыўся, што іх расточаць і зробяць да іх галоўкі з новага тавару. За гэта з мяне ўзялі 35 рублёў 76 кап. Калі я прыйшоў па боты, то аказалася, што галоўкі зроблены са старога тавару, халявы не расточаны. За іх распяганне Верабейчык сказаў, каб я заплаціў далаткова яшчэ 7 рублёў. Даплачваць я адмовіўся, і мне не далі маіх ботаў.

ШЧАЎКУН.

АБ ГАРАДСКОЙ СІГНАЛІЗАЦЫІ

(ПІСЬМО СЛУЖАЧАГА)

У Віцебску з-за дрэннай планіроўкі горада, вузкіх вуліц і частых паваротаў адбываюцца аварыі аўтамабільнага транспарту. Каб унікнуць аварыі, неабходна тэрмінова наладзіць рэгуляванне вулічнага руху, устанавіць сігналізацыю. Віцебскі-ж горсавет далей вынясення пастаноў нічога не робіць у гэтым напрамку.

Таксама бяздзейнічае і групком саюза шофераў. Ніякай культурна-масавай работы сярод апошніх не праводзіцца.

УСЦІМЕНКА.

НЕЗДОЛЬНАЯ ЗАГАДЧЫЦА

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКА)

Пры Наталаўскім сельсавеце (Клічаўскі раён) ёсць хата-чытальня. Загадвае гэтай чытальняй **Дубовік Анюта.** Пры хаце-чытальні ёсць бібліятэчка, але кнігі нікім не чытаюцца, бо ніхто ніколі не можа застаць загадчыцу ў бібліятэцы. Ніякай грамадскай і культурна-масавай работы сярод калгаснікаў Дубовік не вядзе.

Ці не мог-бы раённы аддзел народнай асветы прызначыць на пасаду загадчыка хаты-чытальні здольнага працаўніка?

ЛАБАНОВІЧ.

ПРЭМ'РАВАЛІ... НА СЛОВАХ

(ПІСЬМО СТАХАНАЎЦА)

На адкрытым партыйным сходзе магілёўскага трубазавода было абвешчана, што мяне, як лепшага стахановца і рацыяналізатара, завод прэмірує кватэрай, мэбляй і гарнітурам. Гэта было на кастрычніцкія святы.

Мінула тры месяцы, а прэміі я так і не атрымаў. Дырэкцыя і заўком кожны раз гаворыць: «Хутка дамо», «будзе прэмія». Адным словам, абяцаюць, а я па-ранейшаму жыву ў старой кватэры, столь якой вось-вось абваліцца.

Так дырэкцыя і заўком клапоцяцца аб быце стахановаў.

ЦЯРЭШЧАНКА.

ПА СЛЯДАХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ «ЗВЯЗДЫ»

«ДУБРОВЕНСКІЯ ЛЕКАРЫ»

Дубровенскі райвыканком паведамляе, што факты, указаныя ў гэтай заметцы, адпавядаюць сапраўднасці.

Райвыканком і райздраў забаранілі ўсім лекпомам дзяжурным сёстрам і фельчарам прымаць хворых у заразны барак без папярэдняга агляду ўрачом.

За накіраванне ў заразны барак хворага дзіцяці без папярэдняга агляду гр. Буко фельчару Касцючэнка і дзяжурнай сястры Кручковай абвешчана суровая вымова.

НАРАДА ПА ПЫТАННЯХ БУДАЎНІЦТВА ПРЫ ЦК КП(б)Б І СНК БССР

Даем прадукцыю добрай якасці і ў вялікай колькасці

З прамовы тав. НІКІФАРАВАЙ—стахановкі-шкляршчыцы будаўніцтва Аршанскага ільнокамбіната

Я працую шкляршчыцай на будаўніцтве аршанскага ільнокамбіната. Спачатку я працавала чорнарабочай. Праз пару месяцаў пасля таго, як я паступіла на ільнокамбінат, перайшла працаваць падручнай па замазцы. Раней я не думала, што ў мяне будуць такія вялікія дасягненні.

Чаму да прапрацоўкі прамовы таварыша **Сталіна** на ўсесаюзнай нарадзе стахановаў справа рухалася марудна? А вось чаму: мы не ўлічылі вялікай палітычнай і практычнай важнасці стахановскага руху. Вось, напрыклад, мне асабіста прыходзілася займацца не сваёй справай. Прыходжу я працаваць, іду да дзесятніка, пытаю—што мне сёння рабіць. «Ідзі пашукай, тое і тое зрабі і т. д.» — адказвае ён. Станоўчага нічога мне не скажа. Чаму? Таму, што ў яго не было планавасці, не было разліку, дзе якога работніка паставіць.

Пасля ўсесаюзнай нарады стахановаў кіраўнікі нашага будаўніцтва пачалі больш патрабаваць ад дзесятнікаў, каб яны дапамагалі рабочаму арганізоўваць працу па-стахановску. Мне прышлося з вялікім трудом дабівацца пераходу на стахановскія метады работы.

У нас на будоўлі кваліфікаваных жанчын мала. Цесляры, штукатуршчыкі — гэта ў большасці мужчыны, а жанчыны больш за ўсё працуюць чорнарабочымі. Мне самой здавалася, калі я прыступіла да работы шкляршчыцы, што гэта кваліфікацыя не для жанчыны. Але я рашыла, што не можа быць на свеце таго чалавека, які пры жаданні не мог-бы свайго дасягнуць. **(Апладысменты).** Я рашыла дабіцца свайго.

На сёнешні дзень я маю наступныя лічбы выканання нормы: у мяне па рамонту норма 44,2 пагонных метраў, выконваю я 137 пагонных метраў. Па новаму шклу норма 80 пагонных метраў, выконваю па 225 пагонных метраў. **(Апладысменты).**

У нас два шкляршчыкі, муж таксама шкляршчык.

Голас. Вы яго абагналі. **(Апладысменты).**

Готфрыд. — Колькі вы зарабляеце?

Нікіфарава. — У мяне трэці разрад—4 руб. 48 кап., а зараз я зарабляю 14 руб. з капейкамі ў дзень. **(Апладысменты).**

Голас. Колькі ваш муж зарабляе?

Нікіфарава. — Мой муж менш зарабляе. Не гледзячы на тое, што я перавыконваю норму, мне не цяжка працаваць. Нельга абвінавачваць усіх дзесятнікаў, што яны дрэнна адносяцца да стахановскага руху. Але я павінна сказаць, што той дзесятнік, у якога я працую, пасіўна адносіцца да гэтай справы. Я прывяду факт. Калі я патрабавала ад яго зводак выканання маіх заданняў, то тры дні не магла дабіцца рэзультатаў. Ён мяне ўсё абяцанкамі карміў. Тады я звярнулася да начальніка будаўніцтва тав. **Маркіна,** і толькі пасля гэтага дзесятнік стаў даваць мне зводкі.

У нас на пабудове некаторыя людзі лічаць, што жанчына дае горшую якасць прадукцыі, чым мужчына. А між тым у нас ёсць жанчыны настолькі здольныя, што яны ў некалькі разоў абганяюць мужчын, даюць прадукцыю добрай якасці і ў вялікай колькасці. **(Апладысменты).**

Мае метады работы

З прамовы тав. ФУНТА—стахановца-штукатура Менбуда

Таварышы, я хачу расказаць аб тым, як я стаў стахановцам і як я дабіўся сваіх рэкордных паказальнікаў.

Калі я прачытаў у газеце пра рэкорд Алексея **Стаханава,** задумаўся і рашыў ва што-б там ні стала прымяніць яго метады ў сябе на будоўлі. У гэты час я працаваў у Менбудзе на пабудове інтэрната Белдзяржуніверсітэта.

Прыйшоўшы на будоўлю, я зайшоў у кантору да начальніка і сказаў яму, што хачу ўзяць прадукцыйнасць працы, як Алексей Стаханаў. Тав. **Жданаў** пашоў мне насустрач і даў патрэбную колькасць яшчыкаў цвікоў і вылучыў падсобных рабочых у дапамогу.

Працуючы па-новаму я ў першы дзень даў 55 метраў, у другі—57 і ў трэці—62 метры.

Потым мяне перакінулі на другую будоўлю. Там мне таксама вылучылі ў дапамогу некалькі чалавек чорнарабочых. Я растлумачыў ім свае метады работы, расставіў іх як належыць і ў першы-ж дзень мы зрабілі 57 метраў штукатуркі. На наступны дзень работа пайшла яшчэ лепш і мы зрабілі 115 метраў.

Калі я прыбыў на гэту будоўлю, там не было ні аднаго стахановца, а зараз—20 стахановцаў, якія значна перавыконваюць сваю норму.

Готфрыд. А вы колькі процантаў даеце?

Фунт.—958 процантаў **(Апладысменты).**

Готфрыд. А скажыце, лепшыя штукатуршчыкі маглі-б даць такую-ж выпрацоўку, ці нават перагнаць вас?

Фунт. Я быў-бы вельмі рад, каб мяне не толькі дагналі, але і перагналі.

Готфрыд. Колькі людзей вы навучылі працаваць вашым метадам?

Фунт. 20 чалавек. Яны ўсе зараз стахановцы.

Голас. А колькі было ў вас чорнарабочых?

Фунт. Тры: два падносілі, а адзін рыхтаваў раствор.

Ёсць яшчэ ў нас такія інжынеры і тэхнікі, якія не прызнаюць стахановскага руху і думаюць, што калі больш даў, значыцца трэба расцэнкі знізіць і нормы павялічыць. Не выйдзе гэта справа! Колькі я зрабіў, за столькі і заплаці. **(Апладысменты).**

Я на дасягнутым метадзе работы не спынюся. Тут прысутнічае інжынерна-тэхнічны персанал, які ведае аб маіх далейшых намерах. Буду працаваць яшчэ лепш.

Для таго, каб забяспечыць і якасць і колькасць, трэба перайсці на лінейную сістэму. Няхай аб гэтым падумае і інжынерна-тэхнічны персанал.

Трэба на рыштаваннях расставіць столікі і на іх раскласці сокалы. Яны павінны быць фанерныя, 7-мм, з тым, каб я сам не пераходзіў ад яшчыка да яшчыка, а каб была канвеерная сістэма і яшчыкі падавалі ў руки. Калі мы так паставім работу, то дасягнем не толькі 958 процантаў, а куды больш.

Мая памылка, што я адзін працаваў. Тут патрэбна звеннявая работа.

На ўчастку сваёй работы я атрымаў прывітанне ад тав. **Галадзеда** і ад ЦК КП(б)Б. Я запэўняю, што тое адказнае заданне, якое я зараз маю на сваёй будоўлі, выканаю ў тэрмін. **(Апладысменты).**

Тарас Усцінавіч Гарай, брыгадзір калгаса «Совецкая Беларусь», Рэчыцкага раёна, у сябе на кватэры чытае стэнаграфічную справаздачу 2 з'езда калгаснікаў-ударнікаў, удзельнікам якога ён быў.

Фото Я. САЛАВЕЙЧЫКА.

Навесці парадак у справе праектавання

З прамовы інжынера тав. Э. Х. АДЭЛЬСКАГА на нарадзе па пытаннях будаўніцтва пры ЦК КП(б)Б і СНК БССР.

Калі паглядзець ці зрабілі мы поспехі за апошнія некалькі год у справе праектавання, то трэба сказаць, што наадварот, мы далёка пашлі назад. Ісці ў праектную кантору заключаць дагавары і атрымліваць гатовую прадукцыю — гэта сапраўдныя пакуты. Возьмем кошт праектавання. Мы можам сказаць, што зараз за праектаванне бярэцца ў 3—4 разы больш, чым раней. Амаль таксама зусім адсутнічае прапрацоўка тэхніка-эканамічных фактараў.

На складанні каштарысаў сядзяць часта работнікі невысокай кваліфікацыі. Стахановскі рух ніякага адлюстравання не атрымаў у нас у праектных канторах.

Мы павінны нарэшце па-сур'ёзнаму падыйсці да праектнай справы, навесці там поўны парадак. Перш за ўсё трэба забараніць Белдзяржпраекту браць дорага за праекты. Штат, які ёсць там, вельмі вялікі.

У свой час у Белдзяржпраекце пры вылічэнні кошту праекту бралі 100 проц. накладных выдаткаў на рабочую сілу, зараз-жа бяруць 200—230 проц. Я лічу, што праектная кантора павінна зменшыць расцэнку на 25—30 проц. Гэта дасць зніжэнне кошту будаўніцтва прыкладна на 2 проц.

На складанне каштарысаў мы павінны пасадзіць самых вопытных лепшых людзей. Трэба сказаць у парадку самакрытыкі, што нашы інжынеры лічаць, што каштарыс іх не датычыцца. Гэта вельмі шкодная думка. Мы павінны адказных асоб за праекты зрабіць адказнымі таксама і за каштарысы.

Зараз я хачу перайсці да работы, якую мы праводзім у політэхнічным інстытуце, дзе мы выхоўваем будучых інжынераў, камандзіраў вытворчасці.

Ні ў адной галіне няма такой пладатворнай глебы, як у вышэйшай школе, асабліва ў ВТНУ. Перш за ўсё трэба зрабіць так, каб студэнт — будучы інжынер—быў стахановцам, каб вельмі добра ведаў сваю вытворчасць, паглыбляўся ў яе, добра арыентаваўся ў законах прыроды. Трэба ў ім умацаваць разуменне, што норма, гэта не догма. Значыцца, трэба ўзброіцца тэхнікай, узброіцца ведамі і працаваць так, каб норма не была прэдэлам.

І наступнае — гэта сувязь з вытворчасцю. Гэта самае важнае. Мы прывучаем абавязкова нашага студэнта прайсці практыку ў Белдзяржпраекце, Сантэхбудзе, на вытворчасці. Мы імкнемся стварыць поўнапэннага інжынера.

ЗА ТЫСЯЧУ ГЕКТАРАЎ НА ТРАКТАР!

КОЖНЫ ТРАКТАРЫСТ ЗДАСЦЬ ТЭХНІЧНЫ ЭКЗАМЕН

СЯННО. Заклік перадавых трактарыстаў рэспублікі, удзельнікаў усесаюзнай нарады перадавікоў ураджайнасці тт. Зоні Рачок, Змітра Ячмянёва, Рамана Чубакова і Івана Калініна аб разгортванні ўсебеларускага паходу за тысячу гектараў на кожны трактар сустрэў гарачы водгук сярод трактарыстаў Сенненскай МТС.

Перадавыя трактарысты Рупаль Кастусь, Івашка Фёдар, Барытка Іосіф і Бубноў Мікіта, якія ў мінулым годзе ўзаралі па 400 гектараў на трактар, абавязаліся выпрацаваць на трактары ХТЗ не менш тысяча гектараў, даваць высокую якасць работы і эканоміць гаручае. Трактарыст Рыпінскі абавязаўся на трактары СТЗ узараць за сезон 1.500 гектараў.

Зараз трактарысты рамантуюць і дасканала вывучаюць свае машыны.

А. МАХНАЧ.

ЦЕПЛАЯ СУСТРЭЧА

ЯКАЎЛЕВІЧЫ, 8 студзеня. **(Ад спец. кар. «Звязды» на борту самалёта агітэскадрыльі імя М. Горкага).** На пляцоўцы, дзе спусціліся самалёты агітэвяна эскадрыльі імя Максіма Горкага, сабралося многа стахановаў Якаўлевіцкай суконнай фабрыкі і калгаснікаў бліжэйшых сельскагаспадарчых арцелей. Адзін за другім 50 стахановцаў фабрыкі і калгасаў былі падняты ў паветра на сталёвых птушках.

Пасля катання ў фабрычным клубе адбыўся агульны сход рабочых, які трансляваўся па радыё па калгасах Аршанскага раёна. Стахановцы фабрыкі і калгаснікі Якаўлевіцкага сельсавета горача віталі экіпаж эскадрыльі Стахановы **Шаблоўская** і **Марцюсевіч** падверглі рэзкай крытыцы інжынерна-тэхнічных работнікаў фабрыкі — тэхкіраўніка фабрыкі Локсіна, начальніка прадзільнага цэха **Беленкова,** механіка парасілавага цэха **Дарашэвіча,** якія не ствараюць работнікам неабходныя ўмовы для пераходу на абслугоўванне чатырох ткацкіх варштатаў замест двух. Сход прыняў выклік на спаборніцтва рабочых дубровенскай фабрыкі «Днепроўская мануфактура». Экіпаж эскадрыльі вітала дэлегацыя калгаснікаў Якаўлеўскага сельсавета.

Р. ДОДЗІН.

Вялікі ўклад у сельскую гаспадарку СССР

Прайшоўшы 1935 год для Беларускай станцыі механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі быў годам напружанай работы. Накоплен вялікі вопыт па распрацоўцы і канструяванню цэлага раду зусім новых сельскагаспадарчых машын па механізацыі працаёмкіх сельскагаспадарчых працэсаў. Па раду машын станцыя заваявала пярэшынства ў Совецкім Саюзе. Лепшыя канструкцыі машын станцыі пушчаны ў масавую і серыйную вытворчасць.

Намі распрацавана двухрадавая бульбаўборачная машына, якая заваявала пярэшынства на двухмесячных усесаюзных выпрабаваннях і пушчана ў масавую вытворчасць. Прадукцыйнасць яе 0,45—0,50 гектара ў гадзіну, а за 10-гадзінны працоўны дзень —4,5—5 гектараў, прыводзіцца ў рух трактарам «У-2» і эканоміць 50 проц. рабочай сілы. Да ўборачнай 1936 г. разанскім заводам будзе выпушчана 4 тысячы штук гэтых машын, у тым ліку для БССР — 400 штук.

Пуск двухраднай бульбаўборачнай машыны ў масавую вытворчасць з'яўляецца велізарнейшай нашай перамогай.

Станцыя распрацавала і выпрабавала ў гаспадарчых умовах прасцейшую зернасушылку для калгасаў. У сувязі з пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб пабудове ў кожным калгасе прасцейшай зернасушылкі, яна набывае вялікае значэнне для раёнаў нячорназёмнай паласы, у тым ліку і для БССР. Прапускная здольнасць зернасушылкі — поўтоны ў гадзіну. Расход дроў 20—25 кілограм у гадзіну. Задача заключаецца ў тым, каб хутчэй укараніць яе ў калгасную вытворчасць.

Вялікая ўсесаюзнага значэння работа праведзена намі ў галіне механізацыі жывёлагадоўчых ферм.

Намі распрацаваны кормазапарнік, які прайшоў выпрабаванні і прыняты камісіяй Наркамзема СССР. У 1936 годзе намечана выпусціць тысячу такіх кормазапарнікаў. Прапускная здольнасць кормазапарніка 420 кілограмаў бульбы ў гадзіну. Расход дроў 18—20 кілограмаў у гадзіну. Корнерэзка і наземныя дарогі, распрацаваныя станцыяй у 1935 годзе, таксама зацверджаны камісіяй Наркамзема СССР і вызначаны для масавай вытворчасці. Першая серыя корнерэзак у колькасці 250 шт. будзе выпушчана заводамі ў бліжэйшы час. Прапускная здольнасць корнерэзкі — тры тоны бруквы або пяць тон бульбы ці моркву ў гадзіну.

Дарогі для механізацыі ўнутрысядзібнага транспарту па прастаце сваёй канструкцыі могуць быць пабудаваны ў любым калгасе сваімі сіламі і сродкамі з мясцовага матэрыялу, за выключэннем чыгунных скатаў, якія павінна выраблять прамысловасць. Намаганнямі аднаго чалавека на гэтых дарогах можна перавозіць груз у 30—40 пудоў. Толькі па адной БССР намячаецца ў 1936 годзе абсталяваць гэтыя дарогі ў 600 жывёлагадоўчых фермах.

Распрацаваны аўтапрывязі для кароў.

Пушчаны ў серыйную вытворчасць распрацаваны станцыяй балотны плуг Фомічава. У 1936 годзе віцебскі завод «Чырвоны металіст» выпусціць тысячу штук гэтых плугоў для БССР. Побач з плугамі будзе выпушчана невялікая серыя канавакапальнікаў, для меліярацыйных работ. Як плуг, так і канавакапальнік будуць мець вялікае значэнне не толькі для БССР, але і для іншых раёнаў нячорназёмнай паласы.

Пастановай урада БССР перадаецца ў серыйную вытворчасць распрацаваны станцыяй прыбор Клішэвіча для пратручання насення і прыбор Філаненкі для адначасовай працірки клапанаў аўтатрактарных маторaў.

Нарэшце, станцыяй вынайдзены спецыяльныя шпоры-ўшыральнікі для трактараў ХТЗ і СТЗ, павышаючыя выкарыстанне трактараў на пескавых і вязкіх глебах на 15—20 проц.

Распрацаван і рэкамендаван МТС і соўгасам перасовачны заправачны пункт для заправкі трактараў у полі.

Усе пералічаныя машыны і прыборы, пушчаныя ў вытворчасць — вынік гадавой работы маладога і параўнаўча малога калектыва навуковых работнікаў станцыі над новымі канструкцыямі машын.

Гэтымі дасягненнямі навуковыя работнікі і станцыя абавязаны сельскагаспадарчаму аддзелу ЦК ВКП(б), ЦК КП(б)Б і ўраду БССР, якія аказалі нам велізарнае падтрыманне ў рабоце. Прыезд камісіі сельскагаспадарчага аддзела ЦК ВКП(б) вясной 1935 г. на прагляд нашых работ, наведванне нашай станцыі кіраўнікамі ЦК КП(б)Б і ўрада БССР натхняе нас на новыя перамогі.

Пускам нашых машын у вытворчасць мы даем краіне дзесяткі мільёнаў рублёў эканомі, уносім каштоўнейшы ўклад у машынізацыю сельскай гаспадаркі СССР.

Вялікая работа праведзена намі ў галіне папулярызацыі машын па механізацыі пярвічнай апрацоўкі ільну. Праведзены выпрабаванні ільнотрапальных машын Антонава, Санталава і Гарлачова і паказ іх у рабоце.

Праведзена выпрабаванне раду машын, у тым ліку трактараў і зернакамбайнаў.

У 1935 годзе падрыхтавана станцыяй для МТС 55 загадчыкаў нафтабаз. Праз выстаўку машын канструкцыі станцыі прайшло больш двух тысяч чалавек, галоўным чынам з раёнаў.

1936 год ставіць перад станцыяй не менш адказныя задачы. Мы павінны будзем перш за ўсё вырашыць механізацыю падборкі бульбы.

Вялікая і зусім новая работа, якая будзе праводзіцца станцыяй —гэта выбар тыпу ветрарухавіка для механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі.

Велізарнейшая работа прадстаіць нам у справе асваення завазімых у БССР у 1936 годзе сельскагаспадарчых машын, як зерна-камбайнаў, бульбаўборачных машын канструкцыі станцыі, бульбапасадачных машын, трактарных акучнікаў і т. д.

Мы павінны падрыхтаваць высокакваліфікаваных камбайнераў і інструктароў па бульбаўборачных машынах, дабіцца, каб бульбаўборачныя машыны і зернакамбайны далі высокія паказальнікі работы. Неабходна падрыхтаваць і выдаць адпаведныя падручнікі па эксплаатацыі гэтых машын.

Вялікая работа кладзецца на нас у сувязі з пускам у 1935—36 гг. машын канструкцыі станцыі. Мы абавязаны аказаць дапамогу калгасам у асваенні гэтых машын.

Вялікае месца ў нашай рабоце ў 1936 годзе займе намячаемая пры станцыі пастаянная выстаўка сельскагаспадарчых машын. Вопыт 1935 года паказаў вялікую патрэбнасць у такой выстаўцы. Стахановка ільну тав. Кавалёва ўпершыню ўбачыла ільнотрапалку Гарлачова на нашай станцыі. Гэтага было даволі, каб тав. Кавалёва не толькі асвоіла машыну ў сваім калгасе, даўшы на ёй вялікую прадукцыйнасць, але і стала інструктарам у суседніх калгасах па асваенню «Гарлачовак».

МАЦЭПУРА.

Дырэктар Беларускай станцыі механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі.

ПІСЬМЕННІКІ СОВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

ПЯТРУСЬ БРОУКА

Калі П. Броўка чытае свой верш «Праз горы і стэп», хочацца апладзіраваць яму. Ледзь стрымліваеш сваё напружанне і хваляванне. Верш напоўнены палкасцю, вялікім пачуццём любві да байцоў Чырвонай арміі.

Да верша «Праз горы і стэп» П. Броўка прышоў не адразу.

Як і ў кожнага паэта, на творчым шляху П. Броўкі былі прарывы і дасягненні.

Першыя яго кнігі («Гады як шторм», «Прамова фактамі», «Цэхавыя будні»), не гледзячы на іх некаторую паэтычную недапрацаванасць, прасякнуты балзёрасцю, аптымізмам, вялікай верай у перамогу сацыялізма.

Вершы, змешчаныя ў гэтых кнігах, П. Броўка прысвячае ўдарнікам нашых фабрык і заводаў, калгаснікам, чырвонаармейцам, нашаму гераічнаму комсамолу. П. Броўка любіць пісаць пра комсамол. Ён з ім арганічна звязан. Комсамолу П. Броўка прысвяціў рад вершаў і паэму «Калі пачыналася маладосць», са старонак якой паўстаюць карціны падпольнага жыцця і барацьбы беларускіх комсамольцаў з белапольскімі якупантамі. Удзелу комсамола ў сацыялістычным будаўніцтве прысвечана аповесць П. Броўкі «Каляндры».

П. Броўка даволі хутка перамог тыя дробнабуржуазныя пазіцыі, якімі адзначаліся ранняя яго вершы. Ён актыўна ўключыўся ў рады беларускай пролетарскай паэзіі. На многіх ранніх вершах паэта ляжала пячатка таннай рыторыкі, абстрактнасці і схематызма.

Усё гэта перамагае П. Броўка ў працэсе сваёй далейшай творчай работы.

У вершах П. Броўкі апошніх гадоў абстрактнасць уступіла сваё месца канкрэтнасці, танная рыторыка — патэтыцы, сюжэтная раскіданасць — кампазіцыйнай стройнасці... З'явіліся канкрэтныя вобразы, героі нашай эпохі—новыя сацыялістычныя людзі.

Кніга «Прыход героя» характарызуецца тэматычнай рознастайнасцю. Тут вершы пра імперыялістычную вайну і героіку грамадзянскай вайны, пра капіталістычны свет і нашу квітнеючую краіну, пра Вялікую пролетарскую рэвалюцыю і набліжэнне сусветнага штурму капіталізма, пра адзінства нацыянальных рэспублік нашага Саюза, пра Чырвоную армію, пра новых гераічных людзей, пра заможнасць...

Праз усе гэтыя вершы чырвонай ніткай праходзіць бязмежная любоў да нашай дарагой сацыялістычнай радзімы. З усёй кнігі «Прыход героя» асабліва вызначаюцца вершы «Праз горы і стэп», «1914», «Браты», «Заможнасць» і інш. П. Броўка адлюстроўвае ў сваіх вершах новыя, сацыялістычныя адносіны да чалавека, новую, камуністычную мараль, новую дружбу.

Стогадовы калгасны пастух Тарас не жыве ўжо больш у крывой і пахілай хаце. Тарасу збудавалі новую, прасторную, светлую хату. У хату лепшага калгасніка Гараса прыходзіць заможнасць:

«І малодшая ўнучка
У трыццаць гадоў
Нам падносіць з павагаю
Поўныя місы.
Роўна ставіць у рад
Кубкі з мёдам пахучым,
І, здавалася, быццам —
Вось толькі з ракі
Рыбы б'юцца хвастамі
Па патальнях пякучых
З розных пушчаў у талеркі
Прышлі баравікі».

Не так даўно П. Броўка надрукаваў верш «Садоўнік». На фоне квітнеючай прыроды паданы вобраз садоўніка—нашага совецкага садоўніка, які сваёй сумленнай работай вырасціў цудоўны сад.

Гэты садоўнік чуе ў шэлесце лісцяў маладых, сакавітых дрэў шчасце нашага Саюза, пра Чырвоную армію, пра новых гераічных людзей, пра заможнасць...

Праз усе гэтыя вершы чырвонай ніткай праходзіць бязмежная любоў да нашай дарагой сацыялістычнай радзімы. З усёй кнігі «Прыход героя» асабліва вызначаюцца вершы «Праз горы і стэп», «1914», «Браты», «Заможнасць» і інш. П. Броўка адлюстроўвае ў сваіх вершах новыя, сацыялістычныя адносіны да чалавека, новую, камуністычную мараль, новую дружбу.

У П. Броўкі ёсць усе даныя, каб, перамагаючы труднасці на сваім творчым шляху, сумленна і аддана працуючы, усё больш і больш авалодваючы культурай паэтычнага слова, вывучаючы законы нашага жыцця, дасягнуць вышынь паэтычнага майстэрства.

С. ЛЕВІН.



Ленінградскі дзяржаўны фарфаравы завод імя Ламаносава выпусціў мастацка выкананы сервіз, афармлены на тэму «Першае метро ў СССР». Сервіз выкананы па малюнках мастака Л. Пратапопавай. НА ЗДЫМКУ: узоры з новага сервіза.

Фото ЗІВЕРТА (Саюзфото).

ГАСЦІНІЦА У РАЁНЕ

Вялікае памяшканне капыльскай раённай гасцініцы знадворку радуе вока кожнага прыезджага. «Вось, дзе можна будзе сагрэцца і адпачыць», — думае ён. Але пры ўваходзе ў гасцініцу прыходзіцца горка расчаравацца. У нос дзьме густы своеасаблівы кухонны пах. У кутку вялікай залы, якая прызначана для адпачынку наведвальнікаў, прытуліўся невядомай афарбоўкі пасудны стол-шафа, а на ім — графін з адламанай шыйкай, — да рэчы, адзін на ўсю гасцініцу. Намеснік загадчыка гасцініцы (яначе вартавы і прыбіральшчыца) патрабуе пашпарт і дае ключ ад пакоя. На гэтым яе абавязкі вычарпаны.

Вы заходзіце ў даволі прасторны, але брудны пакой. Вешалкі ў пакоі няма, і вопратку прыходзіцца класці на стандартны стол-шафу, які займае амаль адну чвэрць плошчы пакоя. На іржавым жалезным ложку цвёрды матрац. Спаць яшчэ рана. Можна пачытаць газету, сыграць партыю ў даміно, шаркі ці шахматы. Але гэтай «роскашы» ў капыльскай гасцініцы няма. На сцяне ў зале вісіць ахрыпшы рэпрадуктар, але, каб паслухаць радыё, няма на чым сядзець. Ва ўсёй гасцініцы можна знайсці 3—4 паламаныя крэслы. Апрача ўсяго—холодна.

Знадворны выгляд двух слуцкіх гасцініц нічым не адрозніваецца ад капыльскай, але пры ўваходзе ў калідор адразу адчуваецца парадак і чыстата. У невялікіх пакоях стаяць мяккія з беласнежнай бялізнай ложкі, на сталах — графіны з гатаванай вадой, на сценах — люстры, вешалкі. Адпачываць дзём на ложках не дазваляецца, — для гэтага амаль у кожным пакоі стаіць канапа. Вечарам можна правесці вольны час за рознымі гульнямі. Як правіла, кожны дзень у пакоях і калідорах выціраюцца мокрай анучай падлога, дзверы, вокны. Цёпла, чыста і светла.

Раённая гасцініца, апрача сваіх прамых абавязкаў павінна прывіваць культуру людзям, якія ў ёй начуюць. Ці можа гэта рабіць капыльская гасцініца? Між тым, у многіх раённых гасцініцах, як і ў капыльскай, у добрым памяшканні пануе бруд і бескультур'е.

Н. ВІШНЕЎСКІ.

МАЛАДЫЯ БАЙЦЫ НА ВУЧОБЕ

Маладыя чырвонаармейцы 1913 года нараджэння, нядаўна папоўнішыя часці Менскага гарнізона, актыўна прыняліся за баявую і палітычную вучобу. Паспяхова ідзе страявая падрыхтоўка. Многія з іх па-ўдарнаму вывучаюць выданую ім зброю і авалодваюць нарматывамі фізічнай культуры. Хутка асвоіліся з ваеннай дысцыплінай і на «выдатна» выконваюць службу дневальнага па роце і іншыя абавязкі.

У Н-скай часці маладыя байцы цяпер узмоцнена трэніруюцца на вынослівасць. Яны аўладалі тэхнікай кроку на лыжах і робяць пераходы на 15—20 кілометраў. Ідзе масавая здача зімовых норм на значок «Гатоў да працы і абароны».

За прайшоўшы месяц вучобы часць паказала ўзоры ўдарнай работы з новым папаўненнем. Падраздзяленні спаборнічаюць на лепшае асваенне ваеннай тэхнікі і выхаванне байца.

Па-ўдарнаму, сур'ёзна працуюць байцы. Добра, весела і культурна адпачываюць яны ва ўтульных клубах, ленінскіх кутках і ў інтернатах. Кожны з маладых байцоў — удзельнік аднаго пі некалькіх гурткоў чырвонаармейскай самадзейнасці. У часцях працуюць гурткі харавыя, музычныя, літаратурныя і інш.



48-кватэрны дом будуецца ў г. Рэчыцы для рабочых. Дом Капчаткова будзе закончан і заселен к 1 мая 1936 г.

Фото Я. САЛАВЕЙЧЫКА.

Нагляданне зацмення месяца з аэрастата

МАСКВА, 9 студзеня. (БЕЛТА). 8 студзеня нагляданне за зацменнем месяца з зямлі аказалася немагчымым: густыя хмары засланілі месяц. Таўшчыня слоя хмар дасягнула трох тысяч метраў. Вучоным прыйшлося адмовіцца ад меркаваўшагася палёту на самалёце, бо абледзяненне крылляў і фюзеляжа выклікала б катастрофу. Вучоныя звярнуліся да выдомага савецкага стратанаўта, ордэнаносца Г. А. Пракоф'ева, з просьбай прадставіць ім магчымасць зрабіць навуковыя нагляданні за зацменнем месяца з аэрастата. Тав. Пракоф'еў жыва адгукнуўся на прапанову вучоных і прыняў актыўны ўдзел у арганізацыі палёту.

8 студзеня ніжэй 19 і 20 гадзінамі пад Масквой падняўся субстратастат аб'ёмам 2.200 кубаметраў пад камандай выдомага стратанаўта-ордэнаносца К. Я. Зіпе.

Пад'ём субстратастата мае значную цікавасць. Ён з'яўляецца першым начным высотным палётам у вымовых умовах пры неспрыяючым надвор'і. Зніжэнне субстратастата забяспечан кіслародным прыладамі і прыладамі для вызначэння метэаралагічных элементаў.

***

МАСКВА, 9 студзеня. (БЕЛТА). Вылецеўшы 8 студзеня ўвечары для наглядання за зацменнем месяца субстратастат 9 студзеня ў 3 гадзіны 20 мінут раніцы ўдачна прызямліўся за 5 клм. ад Балахны. Зніжэнне здароў. Самаадчуванне пілотаў, тт. К. Я. Зіпе, І. М. Агафонава і вучонага астранома Н. Ф. Флора, найлепшае.

Субстратастат падняўся на вышыню 6.500 метраў. Воблачны слой, які дасягаў таўшчыні 4 клм., пройдзен субстратастатам на працягу 10 мінут. Не гледзячы на цяжкія метэаралагічныя ўмовы, абледзяненне абалонкі субстратастата не было. Заданне выканана поўнасцю. Непасрэдны нагляданні за зацменнем месяца адбываліся на працягу трох гадзін. Прыклады працавалі бесперабойна. Усе навуковыя работы прайшлі добра.

ТЭЛЕФОН-ТЭЛЕГРАФ-РАДЫЁ

У 1936 годзе на будаўніцтва і рэканструкцыю сродкаў сувязі ў БССР намячаецца затраціць каля 10 мільёнаў рублёў. У Гомелі будзе пераабсталявана міжгародняя тэлефонная станцыя. Магутная міжгародняя тэлефонная станцыя будзе пабудавана ў Магілеве.

На менскім тэлеграфе сёлета ўстанаўлюецца першы ў БССР більдапарат для перадачы адбіткаў з Менска ў Маскву і назад. На гэта асігнуецца звыш 100 тыс. рублёў. Пачнецца перабудова віцебскай тэлефоннай станцыі на поўаўтаматычную. У Асіпавічах, Горках і многіх іншых раённых цэнтрах будуць устаноўлены больш буйныя тэлефонныя станцыі, на што марнуецца затраціць 200 тыс. рублёў.

Намячаецца дадаткова тэлефанізаваць 100 сельсоветаў, 15 МТС і 50 соўтасаў. Будуць пабудаваны дамы сувязі ў Асвеі, Старцах (цэнтр Кіраўскага раёна), Азярышчы (цэнтр Мехаўскага раёна), Капыль і будынкі для чыгуначных сартыровачных пастоў у Оршы і Полацку. Распрацоўваецца пытанне аб пабудове ў некаторых раённых цэнтрах станцый для радыётэлеграфных і тэлефонных перадач. 1 мільён рублёў будзе затрачан на пераабсталяванне раённых радыёвузлоў і павелічэнне колькасці радыёкропак у калгасах.

НАВУКА Ў ДАПАМОГУ РАБОЧЫМ-СТАХАНАЎЦАМ

Пяць брыгад навуковых работнікаў інстытута харчовай прамысловасці БССР разам з інжынерамі, тэхнікамі і рабочымі-стахановцамі зрабілі тэхнічную праверку работы паасобных агрэгатаў крухмальных, плодавінных і піваварных заводаў рэспублікі. Праверка дала магчымасць распрацаваць рад мерапрыемстваў, спрыяючых далейшаму ўкараненню стахановскіх метадаў у харчовую прамысловасць БССР. Так, напрыклад, магутнасць буйнейшых механізаваных крухмальных заводаў у Талачыне і ў Чырвоным Беразе вызначалася совецкімі і замежнымі спецыялістамі ў 82 тоны бульбы ў суткі. У сувязі з тым, што да апошняга часу гэта магутнасць не асвойвалася, гаспадарчыя арганізацыі «абгрунтавалі» новую магутнасць у 72 тоны. Стахановцы, пры дапамозе навуковых работнікаў, перакрылі ўсе гэтыя нормы. Чырвонабярэжскі завод пераапрацоўвае штодзенна да 95 тон бульбы, талачынскі завод—96 тон. На менскім піваваранным заводзе «Беларусь» укараняецца пераход на больш цёплае бражэнне, што павялічвае прадукцыйнасць завода да 85 тыс. гекталіграў у год. Брыгады інстытута сабралі на прадпрыемствах 114 каштоўных прапаноў стахановцаў аб паляпшэнні рабочага месца, змяншэнні страт, паляпшэнні якасці прадукцыі і інш.

ПАХОД ПА СЛЯДАХ ПАЛЕСКІХ КОМУНАРАЎ

ГОМЕЛЬ, 9 студзеня. (Кар. «Звязды»). Комсамольская арганізацыя Гомеля праводзіць паход «па слядах палескіх комунараў» для вывучэння гісторыі рэволюцыйнага руху ў Гомелі. Удзельнікі паходу азнаёмяцца з падпольнай друкарняй 1905 года і друкарняй 1914 года, дзе быў арыштаваны тав. Хатаевіч. Яны наведваюць памяшканне Палескага камітэта ў 1917 годзе, кватэру і месца работы тав. Л. М. Кагановіча і вывучаць літаратуру, якая звязана з паходам.

ПРАВЕРКА СТАНОВІШЧА ПАЗЫКОВАЙ РАБОТЫ СЕЛЬСОВЕТАЎ

У мэтах упарадкавання пазыковай работы ў сельсоветах і забеспячэння поўнага збору пазыковых сродкаў на вёсцы, прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР прапанаваў Наркамфіну, Цэкамсоду, старшыням оргкамітэтаў ЦВК па акругах, райвыканкомаў, і горсоветаў арганізаваць у студзені праверку становішча пазыковай работы сельсоветаў. Старшыням райвыканкомаў і горсоветаў прапанавана абмеркаваць на прэзідыуме акты абследванняў, пыняўшы адпаведныя рашэнні. Прэзідыум ЦВК прапанаваў Цэкамсоду і Наркамфіну БССР накіраваць у сельсоветы брыгады работнікаў фінансава-ашчаднага апарата і актыву горкамсоваў для дапамогі ў правядзенні праверкі.

КАРАДЖЭННЕ ЧАЛАВЕКА

У новым доме на свет з'яўляюцца маленькія грамадзяне совецкай краіны, якая стварае для матцы і яе дзіцяці самыя лепшыя ўмовы, акружае іх абодвух пяшчотнымі клопатамі. Асаблівай папулярнасцю ў Менску карыстаецца цэнтральны раздзільны дом на вуліцы Валадарскага. Узорная чыстата і ветлівыя адносіны да рожаніц спалучаюцца ў ім з высокім веданнем справы з боку абслугоўваючага персанала.

Рожаніца перш за ўсё попадае ў душавы пакой, дзе праходзіць санітарную апрацоўку. У чыстай бялізне на ложку з матрацам яна знаходзіцца ў прадрадавой. Побач знаходзіцца родавая палата. Тут круглыя суткі дзяжурыць урач, акушэркі, сёстры і сядзелкі. Іх вопытны маглядз не пакідае рожаніц ні на мінуту. Як толькі дзіця нарадзілася, яму адяваюць на ручку браслет з цыфраты, на якім пішацца прозвішча, імя маткі і нумар гісторыі яе хваробы. Дзіця кладзецца ў ложак з тым-жа нумарам, што і ложак маткі. У двух вялікіх і светлых пакоях стройнымі радамі стаяць ложкі рожаніц, ля кожнага маленькая шафа, крэсла і радыё. Дзіця прыносяць да маткі некалькі разоў у дзень.

Як толькі чалавек з'явіўся на свет, трэба аб гэтым паведаміць бацьку. У чакальні знаходзіцца вітрына, дзе штодзенна запісваецца, што грамадзянка такая-то нарадзіла хлопчыка ці дзяўчынку. У раздзільным доме ўсяго 73 ложкі. Загрузка, як тут жартуюць, больш чым стопроцантная. У сярэднім кожныя суткі нараджаецца 10—15 дзяцей.

Рожаніца ў раздзільным доме знаходзіцца 8—10 дзён, за якія яна папраўляе сваё здароўе. Кормяць чатыры разы ў дзень. Як правіла, дзяцей забіраюць адсюль вагой ад 2,5 да 3 кілограм. Шчаслівыя маткі, ад'яджаючы дамоў, дзякуюць работнікам раздзільнага дома.

Галоўны ўрач раздзільнага дома Л. Н. Собалеў, які прыехаў сюды на работу з Свердлоўска, буйны спецыяліст, укладае ў справу шмат любві і адданасці. Тав. Собалеў доўгія гады працуе над пытаннем абязбольвання родаў. У снежні ўпершыню ў раздзільным доме быў зроблен вопыт абязбольвання родаў успрыскваннем новакаіна ў зоне Геда. Рожаніца Е. Н. Юронак нарадзіла хлопчыка і заявіла, што так раджаць «значна, значна лягчэй».

Памяшканне раздзільнага дома цеснавата. Зніжэнне гэтага недахопу—пытанне самага бліжэйшага часу, калі Менск узбагаціцца новымі выдатнымі раздзільнымі дамамі.

Н. ГАСМАН.

ДАСЛЕДВАННЕ ЗАПАСАЎ ТОРФУ

Даследчая тарфяная партыя Наркамзема БССР у 1935 годзе даследвала ў розных раёнах 125 тысяч гектараў тарфяных масіваў, з якіх 22 тысячы гектараў ужо здаюцца ў эксплаатацыю. Для Белгалоўспірта даследваны 8 тарфяных балот, якія забяспечваюць пераход 8 спіртзаводаў на тарфяное паліва. Закончаны суцэльныя даследванні торфамасіваў у Багушэўскім, Кармянскім, Чачарскім, Прапойскім, Бабруйскім, Петрыкаўскім і іншых раёнах. Выяўлены новыя тарфяныя базы, у прыватнасці масіў Булгакоўшчына (Клімавіцкі раён), які стане апалавай базай для Крычаўскага цэментнага завода.

На 1936 год намечаны даследчыя работы на Бялыніцкіх балотах для стварэння апалавай базы для Магілева. Намячаецца дэталёва даследваць 20 тысяч гектараў для прамысловасці, 5 тысяч гектараў для сельскай гаспадаркі і правесці рэкагнасцыроўку 120 тысяч гектараў.

ДОМ АДПАЧЫНКУ РАБОЧЫХ ЛЕСАКАМБІНАТА

БАБРУЙСК, 9 студзеня. (Кар. «Звязды»). ЦК саюза лесапілення цэнтра і поўдня СССР рашыў у 1936 годзе пабудаваць пры Бабруйскім лесакамбінаце дом адпачынку. Для гэтай мэты ЦК саюза адпусціў 40 тыс. рублёў і лесакамбінат — 60 тыс. рублёў.

ІГОЛКІ ДЛЯ ІЛЬНЯНОЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

ВІЦЕБСК, 9 студзеня. (БЕЛТА). Іголкавы завод у 1936 годзе павялічвае выпуск прадукцыі ў параўнанні з мінулым годам на 47 проц. Упершыню завод будзе выпускаць іголкі для ільняной прамысловасці, якія раней увозіліся з-за граніцы. Гэтых іголак завод дасць 350 мільёнаў штук. Сёлета пачнецца будаўніцтва новага іголкавага завода, на што асігнавана 1 мільён рублёў.

КОРАТКА

(Ад карэспендэнтаў «Звязды» і Белта)

* Раённая школьная спартакіяда па лыжах адбылася ў Лёзне. У спартакіядзе прымалі ўдзел 123 вучні сельскіх школ.

* 80 лепшых ударнікаў школ Магілева—дзеці стахановцаў адпачываюць ва ўсебеларускім профсаюзным доме адпачынку.

* Літаратурны гурток рэгулярна працуе ў калгасе «Асвета», Клічаўскага раёна. На занятках прачытаны «Дрыгва» Коласа, «Трэцяе пакаленне» Чорнага і «Чапаеў» Фурманава.

* Шэсць мядзведжых бярлог абложаны паляўнічымі ў беларускім дзяржаўным запаведніку. У канцы студзеня пачнецца паляванне на двух мядзведзяў.

* Журнал мод у прыгожай мастацкай вокладцы выпусціў Белшвейтрэст. У журнале ёсць больш 400 фасонаў мужчынскай, жаночай і дзіцячай вопраткі сёлетняга сезона.

* 10 тэхнічных кабінетаў для выналходцаў і стахановцаў працуюць на буйнейшых прадпрыемствах БССР. Цэнтральны совет выналходцаў адпусціў 16 тыс. рублёў для ўмацавання работы кабінетаў.

* Закупку і дастаўку прадуктаў з горада на аўтамашыне для стахановцаў, якія пражываюць на рабочым пасёлку, арганізаваў заўком мазырскага лесапільнага завода «Пролетарый».

ЗДАРЭННІ

* Буйны злачынца. Работнікі крымінальнага вышуку БССР затрымалі ў Менску І. М. Дразда, асуджанага на 10 год за падлог і які ўцёк з папраўча-працоўных лагераў. Па пашпарту брата Дрозд паступіў буфетчыкам на смалявіцкі торфазавод, дзе ўкраў 5.000 рублёў і ўцёк. У Дразда знойдзены 4 пашпарты. Апошні час ён жыў па пашпарту жыхара Астрашынка-Гарадзенскага сельсовета, Менскага раёна, К. П. Пяткоўскага, які знік невядома куды 9 лістапада 1935 года. Дрозд абвінавачваецца ў забойстве Пяткоўскага і прыцягваецца да судовай адказнасці.

* Група зладзеяў. На прапягу снежня ў Віцебску адбыўся рад кватэрных краж з узломам. Крымвышук арыштаваў групу зладзеяў Гарбачэнка Г. А., Гілбанава П. А. і Багамольцаву В. А., якія рабілі ўсе гэтыя кражы. Багамольцава расшуквалася феадасійскім крымвышукам за падробку дакументаў. Чацверты ўдзельнік зладзейскай шайкі ўцёк. Прыняты меры да яго расшуквання.

ЦЕПЛАЕ НАДВОР'Е НА ПАЛЕССІ

МАЗЫР, 9 студзеня. (Кар. «Звязды»). Ужо больш тыдня ў Палессі стаіць цёплае надвор'е. Тэмпература паветра днём дасягае 4—5 градусаў цяпла. На палях і ў лясах зусім няма снегу, рака Прыпяць ачысцілася ад лёду. Асабліва цёплае надвор'е ў Жыткавіцкім і Тураўскім раёнах, дзе жывёлу выганяюць на пашу. Некаторыя калгасы праводзяць заблівае ворыва.

ЗЯРКАЛЬНЫ КАРП І СУДАК У АЗЕРАХ

У 1935 годзе Белрыбтрэст упершыню правёў засяленне сямі азёр БССР карпам-гадавіком з мэтай акліматызацыі яго ў азёрных умовах. Было заселена 50.000 штук карпа. Кантрольны і вопытны абловы далі самыя станоўчыя рэзультаты. Сярэдняя вага рыбы праз тры месяцы дасягала 350—500 грам. У бягучым годзе па сістэме Белрыбтрэста будзе праведзена засяленне карпам-гадавіком 9 азёр у колькасці 75.000 штук. Апрача таго, упершыню ў БССР будзе праводзіцца работа па акліматызацыі ў азёрах судака.

ПАВЕДАМЛЕННІ

Усім прапагандыстам, якія атрымалі ў снежні 1935 года літаратуру (газеты і журналы) па спіску прапагандыстаў Менгаркома КП(б)Б і прапагандыстам, якія ўключаны ў гэты спіс упершыню (па вестках, прадстаўленых сакратарамі парткомаў), не пазней сёнешняга дня (г. зн. 10 студзеня) афарміць сваю падпіску на «Праўду» і «Звязду» на 1936 год і ўнесці падпісную плату за студзень па красавіку месяцы па адрасу: вул. Карла Маркса, 10, Саюздрук (ад 9 гадзін раніцы да 6 гадзін вечара).

Тым, якія не ўнясуць падпіснуюплату за газеты да 10 студзеня, высылка газет будзе спынена.

Культпроп Менгаркома КП(б)Б.

10 студзеня 1936 года, у 7 гадзін вечара, у клуба імя Сталіна (раён Комсамольскай і інтэрнацыянальнай) склікаецца агульны сход усіх комуністаў і кандыдатаў-адзіночак Кагановіцкага раёна.

10 студзеня, у 7 гадзін вечара, у Доме партаўтыва Менгаркома КП(б)В (пакой № 21) адбудзецца кансультацыя для прапагандыстаў гурткоў па гісторыі ВКП(б) і кіраўнікоў кандыдацкіх школ.

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІН.

Газетныя радкі

КУРСЫ РЭДАКТАРОЎ КАЛГАСНЫХ НАСЦЕНГАЗЕТ

У Асвеі адбыліся дзесяцідзённыя курсы рэдактараў калгасных насценгазет. На курсах вучыліся 23 рэдактары з больш буйных калгасаў раёна. («Ленінскі шлях»).

СЕЛЬСКАЯ ПОШТА

Пошта ў Пабалаве, Рагачоўскага раёна, прадстаўляе сабою ўзорнае прадпрыемства сувязі. Для наведвальнікаў абсталёван асобны пакой, ёсць перагаворны аддзел. У памяшканні чыста і ўтульна. («Комунар»).

Першы Беларускі дзяржаўны тэатр БДТ-1 — Сёння, 10 студзеня, ВЯЛІКАДУШША. Пачатак у 8 г. веч. Білеты прадаюцца ў касе тэатра

Гукавы кінатэатр „Чырвоная зорка" — Гістарычны гукавы фільм КАРМЕЛЮК

Гукавы кінатэатр «Пролетарый» — Амерык. гукавы фільм Чалавек-невідзімка

Гукавы кінатэатр «Інтэрнацыянал» — Гукавы мастацкі фільм ГРАНІЦА. „СТАРОЕ ДУДЗІНА"

Кіно «СПАРТАК» З 10 снежня УСХОДНІ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ НАТЭЛА (НЯВОЛЬНІЦЫ ГАРЭМА) драма ў 7 частках. У праграме КІНОХРОНІКА. Штодзенна 4 сеансы. Каса з 4 гадзін дня.

Памяшканне клуба металістаў (вул. Кірава, 12, тэл. 25-384). Сёння, 10 студзеня, Пастаянная картка № 28. СПЕКТАКЛІ СМАЛЕНСКАГА АБЛАСНОГА ТЭАТРА МУЗКАМЕДЫІ „РОЗ-МАРИ". Пачатак роўна ў 8 гадзін вечара. Прымаюцца заяўкі на калектыўнае наведванне і пастаянныя месцы на ільготных умовах. Каса адкрыта з 12 да 2 г. дня і з 5 да 9 гадзін вечара. РЫХТУЕЦЦА ДА ПАСТАНОЎКІ „КАТЯ-ТАНЦОЎЩЫЦА"

Невучальны камбінат Бел. аддз. «СОЮЗОРГУЧЕТ» абвяшчае набор курсантаў на 5-месячныя КУРСЫ інструктароў для райза па падрыхтоўцы для работы на раёне.

На курсы прымаюцца асобы, якія маюць стаж работы па рахункаводству па падвойнай сістэме не менш 2-х год і асвету не ніжэй сямі класаў. Стыпендыя ад 115—140 р., у залежнасці ад акадэм. паспяховасці, і кватэрных 30 руб. у месяц.

Да заявы трэба прыкласці наступныя дакументы: завераную анкету, даведку аб соцстановішчы, адукацыі, узросце, працоўным стажы, аслабаненні ад апошняга месца работы. Прыём па камандыроўках МТС, райза і калгасаў. Тэрмін падачы заяў — да 20 студзеня. Аб залічэнні і пачатку заняткаў будзе паведамлена па пошце. Для адказу трэба прыкласці марак на 40 кап. Заявы з дакументамі накіроўваць па адрасу: г. Менск, Барысаўскі тракт, 55, дашкольны тэхнікум, навучальнаму камбінату «Союзоргучет». Канцэлярыя працуе з 3,5 гадз. дня да 9 гадз. вечара.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Сёння, 10 студзеня, у 19 гадзін. у інстытуце філасофіі БелАН (пакой № 26) адбудзецца ПУБЛІЧНАЯ АБАРОНА ДЫСЕРТАЦЫІ тав. ГУРЫНОВІЧА С. М. на ступень кандыдата філасофскіх навук, на тэму: «Праблема развіцця ў антычнай філасофіі». Апаненты — акад. С. Я. Вальфсон, праф. П. Н. Галанза.

17 студзеня там-жа, публічная абарона дысертацыі т. ЛАПОТКА Б. А. на ступень кандыдата філасофскіх навук, на тэму: «Ленінскае вучэнне аб пенняцці». Апаненты — праф. Выдра і праф. Сапір.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ПРЫ ЗНЕСІЛЕННІ НЕРВОВАЙ СІСТЭМЫ ПРЫМЯНЯЕЦЦА ЛЕЦІТОГЕМАЛЬ (Лецытын і гемаглабін ў таблетках). Спосаб карыстання: па 2—4 таблеткі 2—3 разы ў дзень за гадзіну да яды. ПРОДАЖ ва ўсіх аптэках і магазінах санітарыі СССР. Пры адсутнасці на месцах высылаецца поштай галоўным складам інстытута па атрыманні задатку не менш аднаго рубля з кожнай каробкі. АДРАС: Харьков, ул. Артема, № 12, Укр. институт эндокринологии.

Казарэз Грыгорый Фёдаравіч, упраджэнец Старадарожскага раёна, БССР, пражывае ў г. Менску, мяняе прозвішча на КРЫЛОЎ. Асоб, маючых пратэсты да змены прозвішча, просяць паведаміць у Менскі горЗАГС.

Троцкі Александр Данілавіч, чырвонаармеец, служачы ў г. Віцебску, ураджэнец з вёскі Лугавое, Лугавецкага сельсовета, Мглінскага раёна, Заходняй вобласці мяняе прозвішча на ВІНАГРАДАЎ. Асоб, якія маюць пратэсты да змены прозвішча, просяць паведаміць у Віцебскі горЗАГС.

Слабадзёнак Нікіта Пятровіч, з г. Віцебска, мяняе сваё імя на БАРЫС. Асоб, якія маюць пратэсты, просьба паведаміць у Віцебскі ЗАГС.

АДКРЫТА ПАДПІСКА на ЛЮТЫ і наступныя месяцы 1936 г. на выданні выдавецтва „ЗВЯЗДЫ"

ГАЗЕТЫ: „ЗВЯЗДА" ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: 1 м. — 2 р. 50 к., 3 м. — 7 р. 50 к., 6 м.—15 р., 12 м.—30 р. „ОРКА" ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: 1 м. — 1 р. 20 к., 3 м.—3 р. 60 к., 6 м. — 7 р. 20 к., 12 м. — 14 р. 40 к. „РАУДОНАСІС АРТОЯС" ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: 1 м. — 30 к., 3 м. — 90 к., 6 м. — 1 р. 80 к., 12 м. — 3 р. 60 к.

ЖУРНАЛЫ: „БОЛЬШЭВІК БЕЛАРУСІ" ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: 1 м. — 40 к., 3 м. — 1 р. 20 к., 6 м. — 2 р. 40 к., 12 м. 4 р. 80 к. „БОЛЬШЭВІЦКІ ДРУК" ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: 1 м. — 1 р., 3 м. — 3 р., 6 м. — 6 р., 12 м. — 12 р. „РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ" ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: 1 м. — 40 к., 3 м. — 1 р. 20 к., 6 м.— 2 р. 40 к., 12 м. — 4 р. 80 к.

Падпіска прымаецца ва ўсіх паштовых аддзяленнях, грамадскімі арганізатарамі і пісьманосамі.

Дырэкцыя Першага беларускага дзяржаўнага тэатра (БДТ-1) абвяшчае перарэгістрацыю і абмен абанементных кніжак на спектаклі тэатра сезона 1935-36 г.

Перарэгістрацыя будзе праводзіцца ў бухгалтэрыі тэатра з 15 па 20 студзеня з 11 да 4 гадзін дня і з 7 да 10 гадзін вечара штодзенна.

Не перарэгістраваныя ў паказаны тэрмін абанементы будуць лічыцца несапраўднымі.

ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: Габінет рэдактара — 21-352. Габінет нам. рэдактара — 25-188. Сакратарыят — 20-830. Прамысловы аддзел — 21-356. Аддзел мясцовай інфармацыі—25-189. Партыйны аддзел—21-358. Сельскагаспадарчы аддзел 21-846. Аддзел асветы літаратуры і мастацтва — 23-955. Аддзел пісем—21-399. Загадчык выдавецтва — 21-358. Бухгалтэрыя — 21-845. Аддзел аб'яў і тыражны — 21-351. АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: МЕНСК, Совецкая, 63.

Уп. Галоўлітбела № К—9 Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63. Тыраж 106.045.